Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

22 ЧЭРВЕНЯ 2024 г. СУБОТА № 121 (30255)

ДЗЕНЬ ДЫЯЛОГУ ПАМІЖ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯМІ 6

НОВЫЯ ПРАЕКТЫ «БЕЛАРУСЬФІЛЬМА» 12

ПАКУЛЬ МЫ ПОМНІМ — МЫ ЖЫВЫЯ

22 чэрвеня для беларусаў — жалобная дата. Як і для многіх іншых народаў — пачатак самай страшнай, самай крывавай вайны. Але ж для нас гэта яшчэ і дата пачатку акупацыі — таксама самай страшнай, самай крывавай у гісторыі народа, праз тры гады якой мы не далічыліся кожнага трэцяга, якой толькі цяпер, не азіраючыся ні на кога, знайшлі нарэшце адпаведны сінонім — генацыд. Тое, што цягам трох гадоў тварылі на нашай зямлі фашысты, выходзіць за рамкі ўсяго чалавечага. Мы дагэтуль знаходзім і збіраем сведчанні таго бесчалавечага вар'яцтва, калі нелюдзі, што прыйшлі на нашу зямлю, адмаўлялі нам у праве жыць.

Знаходзім і захоўваем. Каб перадаць як запавет дзецям і ўнукам. Застываем кожны год 22 чэрвеня ў агульнай хвіліне маўчання, молімся за спачын у агульнай малітве, якую ўзносяць у гэты дзень прадстаўнікі ўсіх беларускіх канфесій. Кожнаму на гэтай зямлі ёсць у гэты дзень аб кім памаўчаць і за чый спачын памаліцца. А на месцы нашых спаленых фашыстамі вёсак вялікімі літарамі на камені — не зрушыць бура, не змые дождж — напісаныя словы: «Пакуль мы помнім — мы жывыя», «Каб нідзе і ніколі ў віхуры пажараў яшчэ не ўмірала...» Самы галоўны, вечны для нас запавет.

Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«САМЫЯ МОЦНЫЯ ЛЮДЗІ — У РАЁНАХ»

Высакаякасная прадукцыя, фабрыка здароўя і перспектывы для гарадоў-спадарожнікаў — акцэнт рабочай паездкі Прэзідэнта

Фота БелТА.

Рабочай і адначасова ўрачыстай атрымалася паездка Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Дзяржынск. Найперш кіраўнік дзяржавы абляцеў тэрыторыю раёна і з верталёта ацаніў сітуацыю на палях. Актыўная ўборачная кампанія пакуль не пачалася, але руку на пульсе трэба трымаць пастаянна, тут расслабляцца нельга.

Па прылёце Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу не толькі на сельскагаспадарчыя пытанні, але і на сацыяльныя. Першае пытанне старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандру Турчыну: як Дзяржынскі раён будзе развівацца далей? Раён перспектыўны, таму пытанне надзвычай важнае. Адзін з кірункаў для плённага развіцця Дзяржынскага раёна — сельская гаспадарка. Прэзідэнт азнаёміўся з работай малочнатаварнага комплексу «Ляхавічы» ААТ «Крутагор'е-Петкавічы», якое спецыялізуецца на мяса-малочным кірунку з развітым раслінаводствам. Кіраўнік дзяржавы растлумачыў, чаму гэта паездка не дзеля таго, «каб паглядзець». Па яго словах, падобнае прадпрыемства — новая тэма ў сельскай гаспадарцы.

Чаму? Па-першае, комплекс у Дзяржынскім раёне — адзін з 20 такіх аб'ектаў, будаўніцтва якіх у вобласці прафінансавана за кошт сродкаў сталіцы. Такі падыход звязаны з тым, што менавіта Мінск спажывае значную частку прадукцыі, якая вырабляецца ў рэгіёне. А значыць, трэба і дапамагчы вёсцы. Прэзідэнт заўважыў, што Мінск спажывае прадукцыю, якая вырабляецца і ў іншых рэгіёнах.

СТАР. 2

КАРОТКА

- **У Жодзіне адбыўся семінар-нарада Палаты прадстаўнікоў на тэму «Аб рабоце беларускіх аўтамабілебудаўнічых прадпрыемстваў па рэалізацыі задач Года якасці».**
- Роўна 57 гадоў таму самазвалу БелАЗ-540А і яго мадыфікацыям быў прысвоены Дзяржаўны знак якасці СССР.
- **Каля 1,8 км складзе даўжыня гандлёвых радоў на рэспубліканскім свяце «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»).**

Форум магчымасцяў

Пагадненні, кантракты, дамоўленасці

Брэстчына падрыхтавала ладны пакет прапаноў удзельнікам форуму

З чым едзе Брэстчына на сёлетні Форум рэгіёнаў, якія спадзяванні звязваюць суб'екты гаспадарання з буйным мерапрыемствам, а таксама пра некаторыя культурныя і патрыятычныя складнікі форуму наша сённяшняя размова са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Юрыем ШУЛЕЙКАМ.

— Перш чым гаварыць пра мерапрыемствы будучага форуму, раскажыце, калі ласка, Юрый Вітольдавіч, хаця б коратка пра цяперашні стан супрацоўніцтва Брэсцкай вобласці з Расійскай Федэрацыяй.

— Сёлета працягваецца планамерная работа па паглыбленні супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй. Знешнегандлёвы абарот за першыя тры месяцы года склаў 916,9 мільёна долараў, што істотна перавышае паказчык мінулага года, у тым ліку экспарт (710 мільёнаў долараў) таксама ідзе з павелічэннем аб'ёмаў. Сёння мы ажыццяўляем знешнегандлёвыя адносіны з 76 рэгіёнамі краіны-суседкі.

СТАР. 4



ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2024 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

«САМЫЯ МОЦНЫЯ ЛЮДЗІ — У РАЁНАХ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гэта пытанне варта прыняць да ўвагі кіраўніцтву сталіцы. Тым больш што губернатары іншых абласцей ужо ўзнялі гэта пытанне, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, «узвылі: чаму ў Мінскай вобласці, а не ў Брэсцкай». Кіраўніцтва Мінска паабяцала, што праз год-паўтара, калі будуць вырашаны асноўныя пытанні Мінскай вобласці, комплексы ад цэнтральнага рэгіёна атрымаюць і іншыя вобласці.

Яшчэ адна прычына такой увагі да «Ляхавіч» — жыццёвая: гэта танны комплекс, што, па словах Прэзідэнта, вельмі важна. «Сёлета мы па краіне ўводзім больш за 100 комплексаў. Нам трэба дакладна разумець кошт гэтага мерапрыемства. І калі ў вас сапраўды атрымаўся самы танны малочнатаварны комплекс, нам трэба іх тыражаваць», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што пры будаўніцтве такіх комплексаў не трэба суперархітэктура. Усё павінна быць проста, але эфектыўна. «Прыгожы нармальны праект, мы яго будзем тыражаваць па ўсёй краіне», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка. Тым больш што, будуючы комплексы па такім тыповым праекце, не трэба траціцца на распрацоўку новай праектна-каштарыснай дакументацыі. Яшчэ адзін пункт эканоміі.

Ад комплексаў мы адыходзіць не будзем

Прэзідэнт зрабіў акцэнт на тым, што ад будаўніцтва малочнатаварных комплексаў адыходзіць ніхто не будзе. «Тут усё малако «экстра» з самай высокай якасцю — гэта ж харчаванне людзей і дзяцей нашых. Таму мы павінны сыходзіць ад тых ферм, яны ўжо разбураюцца, і тэхналогіі там зусім іншыя. І ад дробных ферм пераходзіць да комплексаў. Няхай яны будуць на 800 галоў ці на 1200», — сказаў ён. Пры гэтым кіраўнік дзяржавы заўважыў, што не прыхільнік надта вялікіх комплексаў, бо гэта патрабуе лішніх намаганняў і выдаткаў.

Губернатар Мінскай вобласці Аляксандр Турчын звярнуў увагу, што новыя малочнатаварныя комплексы выгадна ствараць на базе старых ферм. Як прыклад ён прывёў МТК «Ляхавічы». Па-першае, ужо ёсць пэўная інфраструктура: воданапорныя вежы, дарогі, электрычнасць і іншыя. Ствараць з нуля даражэй. Па-другое, пакуль будуецца малочнатаварны комплекс, ферма працуе і дае выручку. Па-трэцяе, каровы са старых ферм пасля пераводу на сучасныя комплексы даюць больш малака. Але, як заўважыў Прэзідэнт, калі ўсю жывёлагадоўлю сканцэнтраваць у адным месцы, то прыйдзецца траціцца на многія іншыя аспекты. «Каб мы ва ўгоду лагістыцы, добрым дарогам і іншаму не пачалі ўсё гэта прывязваць. Бо мы потым згубім на лагістыцы з дастаўкай кармоў. Трэба ўважліва да гэтага ставіцца», — адзначыў ён. ААТ «Крутагор'е-Петкавічы», як расказаў дырэктар прадпрыемства Юрый Кліматаш, займаецца і перапрацоўкай прадукцыі, у Дзяржынску працуе некалькі магазінаў. Прадукцыя праз аўтакрамы дастаўляецца ў невялікія вёскі. «Я ўжо шмат разоў казаў, чаму мы падтрымліваем сельскую гаспадарку і гэта дзяржаўная палітыка. Бо ўсё на ёй вісіць яшчэ з таго савецкага часу. І гэта добрая форма, ад яе не трэба адыходзіць», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Вакол гаспадаркі засяроджана больш за 50 вёсак і пяць сельскіх саветаў. «Мы вымушаны падтрымліваць сельскую гаспадарку, таму што ў іх і сацыяльная сфера, і пенсіянеры, і вёскі трэба падтрымліваць у парадку, пакуль яны не зніклі, — адзначыў Прэзідэнт. — За сялян, якія ўклалі сваю працу ў гэту зямлю, мы абавязаны адказваць, за гэтых пенсіянераў. Таму трэба дапамагаць. І кіраўнікоў падтрымліваць матэрыяльна і маральна».

Юрый Кліматаш расказаў, што ўся тэхніка на прадпрыемстве — айчыннай вытворчасці. Што могуць зрабіць сваімі сіламі — робяць. Кіраўнік дзяржавы пацікавіўся ў яго, ці ўсё задавальняе. Юрый Кліматаш запэўніў, што ўсе працуюць якасна і аператыўна. У ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» ёсць практыка, на якую часта звяртае ўвагу Прэзідэнт, — моцная гаспадарка забірае кароў, якіх некаторыя іншыя гаспадаркі не могуць утрымліваць у належных умовах. Так, у гэтым комплексе «прапісаныя» толькі тыя каровы з ферм, якія не спраўляюцца з іх утрыманнем. Як расказаў Юрый Кліматаш, пасля адаптацыі на шосты-сёмы дзень удой ад кожнай каровы значна павялічваецца. Зразумела, што жывёла тут неідэальная, але прадукцыйнасць мінімум на чатыры літры вырасла ў параўнанні з тым, што было на тых фермах. Юрый Кліматаш таксама заўважыў, што ўсе спецыялісты ААТ «Крутагор'е-Петкавічы» працуюць сумленна і якасна, на работу абсталявання нараканняў няма.

«Няма лепшай працы, чым у сельскай гаспадарцы. Я прайшоў гэта. Самая цікавая тут праца. Жывыя людзі, жывая жывёла, жывыя расліны і вынік кожны год», — упэўнены кіраўнік дзяржавы. На першым месцы, безумоўна, вынік.

Прэзідэнт азнаёміўся з дзейнасцю малочнатаварнага комплексу, тэхналогіяй працэсу. Комплекс разлічаны на 1164 дойныя каровы (тры кароўнікі па 388 жывёламесцаў). Тут выкарыстоўваецца інтэнсіўная тэхналогія і ўкаранёна комплекснае механізаванне вытворчых працэсаў. Гэта дае магчымасць забяспечыць круглагадовую раўнамерную вытворчасць малака. На малочнатаварным комплексе «Ляхавічы» плануецца атрыманне 9428 т малака за год і надою на карову 8100 кг.

«Мы будзем сур'ёзна развіваць гэты горад»

Урачыстая частка рабочай паездкі Прэзідэнта была звязана з адкрыццём фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Алімп» у Дзяржынску. Тут адкрыты аддзяленні па футболе, баскетболе, барацьбе, дзюдо і настольным тэнісе. Адпрацоўваецца пытанне адкрыцця аддзялення па плаванні. У канцы мая Дзяржынск адсвяткаваў Дзень горада. І сучасны фізкультурна-спартыўны комплекс — выдатны падарунак гораду. У цырымоніі адкрыцця таксама ўзялі ўдзел старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр Турчын, дырэктар дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы Дзяржынскага раёна Міхаіл Юркевіч, шматразовы чэмпіён Еўропы і свету па дзюдо і самба Юрый Рыбак, пераможца рэспубліканскіх спаборніцтваў па дзюдо Валерыя Трухановіч. Вялікая падзея сабрала і нямала мясцовых жыхароў, якія цёпла віталі Прэзідэнта.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што даўно хацеў прыехаць у Дзяржынск. Таму пагаварылі і пра перспектывы развіцця горада і раёна. «Мы будзем вельмі сур'ёзна гэты горад развіваць. Будзем не толькі тут будаваць вытворчыя магутнасці, заводы, фабрыкі развіваць, сельскую гаспадарку (яна ў вас у нядрэнным стане, я праблем не бачу). Што да прамысловасці, тут дастаткова прадпрыемстваў — з Мінска людзі пачынаюць вяртацца. Мы будзем у будучыні падтрымліваць заводы, фабрыкі перш за ўсё ў гарадах... Хочаш жыллё — калі ласка, ідзі працуй на прадпрыемства, як гэта было калісьці, атрымлівай аранднае жыллё, жыві, пройдзе 25, можа, 30 гадоў, і ты гэта жыллё, можа, як і ў сельскай гаспадарцы, бясплатна атрымаеш, можа, яшчэ нешта. Падумаем сур'ёзна над тым, як падтрымаць нашых прамыслоўцаў жыллём», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што Дзяржынск — гэта горад-спадарожнік. Па яго словах, у наступнай пяцігодцы, можа, нават раней трэба звязаць падобныя гарады, сярод якіх яшчэ Лагойск і Смалявічы, з Мінскам. «Павінна быць чыгунка, а па ёй павінна хадзіць вельмі хуткая тэхніка. Каб за 20 хвілін чалавек мог з Дзяржынска даехаць да Мінска. Тады не будзе праблемы з работай. Чалавек можа жыць у Дзяржынску (амаль як на курорце вы тут жывяце), а ў любы час прыехаць у Мінск для таго, каб працаваць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Гэта важна і для таго, каб прыцягнуць моладзь у такія гарады.

«Фабрыкі здароўя» павінны быць у кожным раёне вобласці

Прэзідэнт звярнуў увагу, што беларусам варта больш адказна ставіцца да свайго здароўя і не спадзявацца толькі на медыцыну. «Калі кожны чалавек, пачынаючы з дзіцяці, будзе клапаціцца пра сваё здароўе (хаця б па мінімуме), не трэба будзе ў аптэку хадзіць і ў бальніцу. І для таго, каб вы не хадзілі па аптэках і бальніцах, мы будуем «цэнтры здароўя» , — адзначыў ён. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што калісьці ён прапаноўваў мець у кожнай школе спартыўныя аб'екты, асабліва ў вёсцы. Але патрэбны і вялікія фізкультурна-аздараўленчыя цэнтры. У кожным раёне поўны на такія цэнтры вялікі. «Людзі асабліва хочуць, каб быў басейн. Вось мы і пабудавалі добры фізкультурна-аздараўленчы комплекс. Гэта для таго, каб мы жылі нездарма, клапаціліся аб сваім здароўі. І самае галоўнае — для таго, каб дзеці нашы мелі магчымасць займацца спортам. Я буду вельмі рады, калі з часам пачую, што чэмпіёны Еўропы, свету, Алімпійскіх гульняў прыйдуць адсюль. А гэта магчыма: самыя моцныя людзі — у раёнах», — заявіў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы выказаў надзею, што такія аб'екты з'явяцца ва ўсіх раёнах вобласці: «Я думаю, губернатар, ён у нас чалавек малады, спартыўны, будзе прытрымлівацца гэтага стылю, і на працягу наступнай пяцігодкі ў кожным раёне мы будзем мець такія комплексы. Няшмат у нас раёнаў, дзе такіх комплексаў яшчэ няма. Таму мы іх павінны пабудаваць. Гэта фабрыка здароўя. І я вам жадаю галоўнага — здароўя, усё астатняе купім».

Аляксандр Лукашэнка асабіста пазнаёміўся з магчымасцямі спартыўнага аб'екта. Ён сустрэўся з аматарскай футбольнай камандай і нават зрабіў сімвалічны першы ўдар па мячы ў гульні паміж ветэранамі футбола Мінскай вобласці. Пас ад кіраўніка дзяржавы разам з даручэннямі атрымаў кіраўнік Мінскай вобласці Аляксандр Турчын. Размаўляючы з футбалістамі, Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў часы сваёй маладосці захапляўся гэтым відам спорту і ў адным з матчаў траўміраваў калена. «Самы цяжкі від спорту ў нас з вамі», — дадаў ён. Спартсмены падарылі Прэзідэнту памятную фатаграфію — здымак быў зроблены 15 кастрычніка 1996 года. У гэты дзень на стадыёне «Дынама» адбыўся таварыскі матч паміж беларускімі ветэранамі футбола і студэнтамі. У гульні ўдзельнічаў і Аляксандр Лукашэнка. А адзін з прысутных на адкрыцці ФАК футбалістаў судзіў тую гульню. Беларускі лідар заўважыў, што ўсе ўмовы для таго, каб маладыя жыхары Дзяржынска і раёна маглі плённа займацца спортам і дасягаць вынікаў, у новым комплексе ёсць. Але зрабіў акцэнт і на тым, што для дасягнення выніку «хварэць» за яго павінен і кіраўнік.

На памяць аб наведванні Дзяржынска Прэзідэнту падарылі сімвал горада — меч Аляксандра Неўскага і шчыт Дзяржынскага. Ён пакінуў гэта ў горадзе, даручыўшы падабраць самае зручнае месца. «Цяпер у Дзяржынску будуць ведаць, што я іх абараняю», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

Жыхары Дзяржынска адпускаць Прэзідэнта не хацелі. Людзі хацелі выказаць словы падзякі кіраўніку дзяржавы, але ён іх спыніў. «А не трэба, не трэба! Я раблю сваю справу. Таму жывіце доўга, здароўя, займайцеся спортам тут. Выдатная зала», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы таксама адзначыў, што прадоўжыць агляд з паветра. «Я перажываю, што гэты ўраган нанясе нам вялікую шкоду, асабліва пасевам. Але Бог пашкадаваў нас. Асобныя палі ёсць, якія крышку па нашай дурасці падмяў, дзе вільготнасць большая, а мы яшчэ ўгнаенняў лішніх кінулі. Але нармальна, жыць можна. Калі ўсё будзе добра, дапамажыце вяскоўцам. У вас гаспадаркі тут моцныя і хлопцы добрыя ўзначальваюць», — сказаў на развітанне Аляксандр Лукашэнка, пажадаўшы дзяржынцам усяго найлепшага.

Валерыя СЦЯЦКО.

Дзяржынск.

Падзея

НАДЗЕЙНАЯ АПОРА ДЗЯРЖАВЫ

Звыш 160 афіцэраў атрымалі дыплом факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл

Гэты важны дакумент, а таксама нагрудны знак аб заканчэнні факультэта выпускнікам Ваеннай акадэміі ўручылі прадстаўнікі вышэйшага ваеннага кіраўніцтва краіны.

Адным з першых афіцэраў павіншаваў **дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ.** Выпуск слухачоў факультэта Генштаба ён назваў не толькі важнай падзеяй для ўласна герояў мерапрыемства, але і для ваеннай арганізацыі, у цэлым краіны. «Асабліва ўлічваючы тую няпростую ваенна-палітычную абстаноўку, якая складваецца вакол Рэспублікі Беларусь, — удакладніў дзяржсакратар. — Сёння Злучанымі Штатамі і іх падзвіжнікамі з блока НАТА беспрэцэдэнтна нарошчваецца ваенна-палітычная абстаноўка ў свеце, ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне калектыўнай бяспекі. Не спыняецца ваенны канфлікт на тэрыторыі суседняй з намі дзяржавы — Украіны, куды Захад усімі сіламі спрабуе ўцягнуць Рэспубліку Беларусь. Краіны на заходніх рубяжах нашай дзяржавы таксама агрэсіўна адносяцца да нас і нашага стратэгічнага партнёра — Расійскай Федэрацыі: павялічваюць ваенную прысутнасць, укладваюць грошы ў ваенныя бюджэты на шкоду эканамічных інтарэсаў сваіх народаў, павялічваюць колькасць вучэнняў, на сістэматычнай аснове праводзяць разведку нашай тэрыторыі, штодзённа ажыццяўляючы палёты ўздоўж граніц нашай краіны».

Каб пазбегнуць самага горшага сцэнарыя, па словах Аляксандра Вальфовіча, кіраўніцтвам краіны, ваеннай арганізацыі выпрацаваны комплекс мер. «І сёння вашы веды актуальныя як ніколі і запатрабаваны, сёння вы патрэбны краіне, структурам сілавога блока, — звяртаючыся да выпускнікоў факультэта Генштаба, падкрэсліў ён. — Гістарычна склалася, што свабода і незалежнасць, мір і бяспека каштуюць дорага. І мы абавязаны з вамі абараніць іх, забяспечыць бяспеку нашай дзяржавы, нашага беларускага народа».

Як звярнуў увагу **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** выпуск слухачоў праходзіць напярэдадні найважнейшай падзеі — 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. «Падзеі апошняга часу паказваюць, што незалежнасць краіны даецца няпростай цаной, — дадаў ён. — Свет, на жаль, не становіцца больш бяспечны. Нарастае дысбаланс у структуры агульнай сістэмы міжнароднай бяспекі. Гарачы канфлікт развязаны Захадам каля нашых граніц. Сёння мы ў поўнай меры адчуваем спробы ўцягнуць Беларусь у вайну. У гэтых умовах дзяржавай робіцца ўсё, каб гэтага не дапусціць, захаваўшы мірнае неба над нашай краінай».

Міністр абароны падкрэсліў, што выпускнікі факультэта Генштаба — людзі, якія першапачаткова сваім лёсам выбралі служэнне Айчыне. «Гэта людзі, якія ўласным прафесіяналізмам, бездакорнай службай атрымалі права кіраваць вялікімі воінскімі калектывамі, гэта сапраўдныя ваенныя прафесіяналы, і, самае галоўнае, выпускнік Ваеннай акадэміі — гэта заўсёды чалавек з глыбокім дзяржаўным мысленнем і патрыёт сваёй краіны, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Заўсёды і ўсюды з няўхільнай цвёрдасцю праводзьце ў жыццё дзяржаўную палітыку, вучыце сваіх падначаленых абараняць нацыянальныя інтарэсы так, як гэта робіць наш Прэзідэнт».

Вераніка КАНЮТА.

ЦЫТАДЭЛЬ ПАМЯЦІ І СМУТКУ

Мерапрыемствы да Дня ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа пачаліся ў Брэсце

На тыдні ў Брэст прыехалі тысячы людзей, якія палічылі сваім абавязкам у гэтыя памятныя дні пабываць у Брэсцкай крэпасці. Гасцініцы абласнога цэнтра запоўнены на 100 працэнтаў. Многія спыняюцца ў свайго і знаёмых. У крэпасці і яе ваколіцах 21 чэрвеня зранку ўжо было вельмі многа людзей.

Знак пашаны і гонару

Сюды прыйшлі, напрыклад, удзельнікі патрыятычнага форуму «Цытадэль памяці», які пачаў сваю работу 20 чэрвеня. Форум прысвечаны 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Удзел у ім прымаюць больш за 140 студэнтаў з 29 навучальных устаноў Беларусі і сямі расійскіх ВНУ. Хлопцы і дзяўчаты, якія займаюцца навукова-даследчай дзейнасцю, дзеляцца сваімі напрацоўкамі. Для іх таксама падрыхтавалі пазнавальна-забаўляльную праграму, якая ўключае ў сябе шматлікія мерапрыемствы гэтых дзён у Брэсце.

Зранку на Гарнізонных могілках было таксама шматлюдна. Летась ва ўрачыстай абстаноўцы тут адкрылі Алею Памяці. Алея ў гонар абаронцаў Радзімы розных нацыянальнасцяў стала яшчэ адным знакам памяці і пашаны ў горадзе, які першым адчуў на сабе страшнае дыханне вайны. З прапановай увекавечыць памяць землякоў, якія загінулі падчас вайны, да гарадскіх улад звярталіся прадстаўнікі былых саюзных рэспублік прыкладна паўтара дзясятка гадоў таму. Тады з'явілася ідэя стварыць Алею Памяці. І вось добрая справа знайшла канкрэтнае ўвасабленне ў памятных плітах — інфармацыйных дошках, якія змяшчаюць звесткі аб слаўных сынах агульнай тады Айчыны, што аддалі жыцці на беларускай зямлі.

У гэтым годзе дабавіліся памятныя плиты ад ленінградцаў і абаронцаў з Рэспублікі Башкартастан. На памятным мерапрыемстве сабраліся прадстаўнікі ўлады і дыпламатычных місій, грамадскіх арганізацый, вайскоўцы, ветэраны, моладзь. Імпрэза пачалася з ускладання кветак да помніка Воіну на цэнтральнай алеі, затым усклалі кветкі на Алеі Памяці.

— Брэсцкую крэпасць абаранялі воіны розных нацыянальнасцяў і народнасцяў Савецкага Саюза, — сказаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Сяргей ЛАБАДЗІНСКІ.** — Сёння мы стаім тут, схіліўшы галовы, каб ушанаваць памяць герояў вайны і яе ахвяр, даць абяцанне берагчы мір, каб перадаць дзецям і ўнукам нашу квітнеючую зямлю. Хачу падзякаваць усім, хто прымаў удзел у стварэнні алеі, ва ўвекавечанні памяці, падзякаваць гасцям з Санкт-Пецярбурга і Башкартастана за ўдзел у сённяшнім мерапрыемстве.

Генеральны консул Расійскай Федэрацыі ў Брэсце Алег МУРАШАЎ гаварыў аб тым, што ў гэтыя дні мы аплакваем кожнага героя вайны, кожнага абаронцу:

— І тым больш каштоўна, што робіць у Беларусі і Расіі па ўвекавечанні памяці нават праз 80 гадоў. Мы адкрылі Алею Памяці героям, якія першымі прынялі на сябе ўдар фашысцкай арміі. Сумесная работа — добры прыклад для іншых рэгіёнаў, гарадоў-пабрацімаў Брэста, трэба працягваць пошукавую работу, каб і далей ушаноўваць памяць сыноў і дачок нашых народаў.

У дарогу — трэці раз

А ў поўдзень на брэсцкім вакзале сабраліся людзі, каб сустрэць «Цягнік Памяці». Павіншаваць равеснікаў з гонарам удзельнічаць у сумесным патрыятычным праекце прыйшлі брэсцкія школьнікі.

Гэты ўнікальны беларуска-расійскі праект упершыню стартаваў два гады таму, таксама 21 чэрвеня, у Брэсце. Тады пасажырамі цягніка сталі дзве сотні беларускіх і расійскіх школьнікаў, летась да іх далучыліся равеснікі з Кыргызстана і Арменіі. А цяпер праект пашырыў сваю геаграфію: у падарожжа выправіліся яшчэ і прадстаўнікі Казахстана, Азербайджана, Таджыкістана, Узбекістана. У складзе каманды памяці па 55 вучняў з Беларусі і Расіі і па 15 іх равеснікаў з названых краін.

Разам яны праедуць па гарадах Беларусі і Расіі. Хлопцы і дзяўчаты наведаюць памятныя мясціны, звязаныя з Вялікай Айчыннай вайной, сустрэнуцца з ветэранамі, прымуць удзел у тэматычных сустрэчах, убачаць многія славутасці, культурныя, гістарычныя аб'екты. А галоўнае, пазнаёмяцца, будуць шмат камунікаваць, абменьвацца думкамі і меркаваннямі.

«Цягнік Памяці» не мае аналагаў, раней нічога падобнага не праводзілася. Ідэя нарадзілася падчас адной з сустрэч кіраўнікоў верхніх палат парламентаў краін — Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Валянціны Матвіенка і Старшыні Савета Рэспублікі нашай краіны Наталлі Качанавай. Кандыдаты на ўдзел у патрыятычна-асветніцкім праекце прайшлі адбор на конкурснай аснове. І вось цягнік рушыў у дарогу трэці раз.

У першыя хвіліны сустрэчы на пероне брэсцкага вакзала **намеснік старшыні Савета Федэрацыі РФ Канстанцін КАСАЧОЎ** пажадаў школьнікам добрай дарогі, цікавых сустрэч, а яшчэ дакранацца душой і сэрцам да гісторыі, знайсці новых сяброў і ніколі іх не страчваць.

Цікавых незабыўных уражанняў на брэсцкай зямлі пажадаў удзельнікам праекта **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК.**

Адразу пасля прыбыцця на пероне з карэспандэнтам газеты падзяліліся думкамі ўдзельнікі праекта. Вячаслаў Бахцін з расійскага горада Жукоўскага вельмі рады ўдзельнічаць у паездцы, спадзяецца даведацца многа новага. Мікіта Мікалайчук з Брэста чакае цікавых сустрэч. А Мар'ям Метраліева з Азербайджана сказала, што абавязкова знойдзе новых сяброў. Усе школьнікі гаварылі аб тым, што перад паездкай паабяцалі сябрам і родным дзяліцца ўражаннямі праз здымкі і пасты, прамую трансляцыю.

У Брэсцкай крэпасці адбылася ўрачыстая цырымонія старту беларуска-расійскага праекта. На плошчы Цырыманіялаў да ўдзельнікаў акцыі далучыліся юнармейцы Паста Памяці. Дзеці абмяняліся сімваламі акцыі, разам усклалі кветкі да Вечнага агню.

У канферэнц-зале Брэсцкага аблвыканкама прайшла афіцыйная частка сустрэчы «Цягніка Памяці» ў выглядзе дыялогавай пляцоўкі. Перад яе пачаткам была арганізавана выстава са здымкаў папярэдніх праектаў. Удзельнікі «Цягніка Памяці — 2024» падарылі **Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ** мадэль цеплавоза — Цягнік Памяці ў мініяцюры, а затым запрасілі на выставу ганаровых гасцей.

Дыялогавая пляцоўка прайшла надзвычай ажыўлена, было шмат выступленняў, пытанняў, адказаў. На пытанні школьнікаў адказвалі віцэ-спікер верхняй палаты расійскага парламента Канстанцін Касачоў, дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Дзмітрый Мезенцаў, старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый Шулейка, Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Наталля Качанава.

— Вельмі сімвалічна, што самая маладзёжная, самая патрыятычная акцыя праходзіць на гераічнай брэсцкай зямлі, — сказала Наталля Качанава. — Адсюль мы адпраўляем ужо трэці цягнік памяці і дружбы. Ведаю, як ганарацца сваім удзелам у праекце старшакласнікі. Спадзяюся, што праект дапаможа вам захаваць памяць у вашых сэрцах і вы будзеце з часам перадаваць памяць далей, новым пакаленням. Мы задумалі гэты праект для таго, каб вы самі ўсё ўбачылі і адчулі, каб пачулі праўду аб вайне з першых вуснаў. У вас будзе такая магчымасць.

Наталля Качанава пажадала шчаслівай дарогі і плённай паездкі, сказала, што ўсіх удзельнікаў чакаюць 3 ліпеня ў Мінску. Падрабязнасці аб правядзенні дыялогавай пляцоўкі — у найбліжэйшым нумары «Мясцовага самакіравання».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.

Спецыяльны рэпартаж

«САПРАЎДНЫЯ ШЭДЭЎРЫ ДЛЯ ГЛЕДАЧОЎ»

У сталіцы прайшоў фінальны канцэрт рэспубліканскага фестывалю

У Палацы Рэспублікі канцэртам «Мінск. Шляхамі мар і ўспамінаў» завяршыўся фестываль «Беларусь — мая песня».

«Мы вельмі ўдзячныя ўсім абласцям, якія правялі бліскучыя канцэрты ў нас у Палацы Рэспублікі, — расказаў журналістам **старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Уладзімір КУХАРАЎ.** — Яны сталі сапраўднымі шэдэўрамі для гледачоў, ніхто пасля іх не застаўся абыякавы. Сёння нам выпаў гонар правесці завяршальны канцэрт. Мы вельмі ўважліва праглядалі ўсе папярэднія, яны выклікалі вялікае ўражанне. І, вядома ж, мы сур'ёзна рыхтаваліся і стараліся, каб прадставіць горад Мінск годна».

У канцэрце ўдзельнічалі вядучыя калектывы і выканаўцы Мінска: тэатр эстраднай песні «Хвілінка», ансамбль народнай музыкі і песні «Шчодрыца», ансамбль танца «Чабарок», найлепшыя студэнцкія творчыя калектывы, паветраныя гімнасты Белдзяржцырка, народны фальклорна-этнаграфічны калектыў «Неруш», «Белы птах», «Вязынка», «Белая Русь» і іншыя. Артысты прадэманстравалі багацце і шматграннасць культуры беларускай сталіцы, векавую мудрасць і працавітасць беларусаў.

Артысты Белдзяржцырка Анастасія і Ягор Каваленка, Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра і шоу-балета «Феерыя» прадставілі пралог «Палёт над горадам». Далей у гледачоў з'явілася магчымасць адкрыць «Вароты Мінска», пазнаёміцца з яго таленавітымі і працавітымі жыхарамі, якія з'явіліся на сцэне ў вобразах сялян, шляхты, рамеснікаў. Затым — адправіцца на метро ў хуткаснае падарожжа па Мінску працягласцю ў 41 кіламетр! Першай станцыяй стала «Тэатральная», бо траціна ўсіх тэатраў Беларусі знаходзіцца ў Мінску. Афішы мільгаюць разнастайнасцю спектакляў. Гледачы ўбачылі нумар «Дывертысмент» у выкананні балета Музычнага тэатра, пачулі «Заздраўную» ад артыстаў Вялікага тэатра. У нумары таксама ўдзельнічалі студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, ансамбль бальнага танца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, зборная каманда Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры па танцавальным спорце.

Наступнай станцыяй у творчым падарожжы стала «Майстровая Слабада», на якой выступілі заслужаныя аматарскія калектывы Беларусі, прадэманстраваўшы сувязь традыцый і фальклору з сучаснасцю. Пра подзвіг беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны нагадала станцыя «Плошча Перамогі», дзе выканалі нумары, прысвечаныя мужнасці і гераізму. Кранальным да слёз стала гучанне «Балады пра маці» ў выкананні Ганны Сцепанковай, эстраднага балета Fusion і курсантаў Ваенай акадэміі. Затым на шляху былі станцыі «Працоўная», «Маладзёжная», «Парк шчаслівага дзяцінства», а завяршылася творчае падарожжа на станцыі «Народнага адзінства», дзе прагучалі знакавыя кампазіцыі, заключнай з якіх стала «Мы — народ».

У фае Палаца Рэспублікі разгарнулася выстава, прысвечаная 80-годдзю вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 50-годдзю прысвоення гонараванага звання «Мінск — горад-герой». Экспазіцыя раскрывае тэму ўплыву падзей Вялікай Айчыннай вайны на гісторыю і культуру Мінска. Яна падзелена на тры блокі: «Вызваленне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у 1944 годзе», «Аднаўленне разбуранага горада» і «Памяць аб Вялікай Айчыннай вайне».

Таксама да праекта стварылі фільм на аснове архіўнай кінахронікі. Яго дэманстравалі на экранах. «Нам было цікава паказаць Мінск, які вызвалілі, які аднавілі і які ён сёння. Сталіца атрымала званне горада-героя менавіта за тое, што працягвала супрацоўнічаць. На відэакадрах ёсць унікальны момант, калі будаўнікі са Сталінграда — такога ж разбуранага, як Мінск, — прывезлі цэглу з легендарнага дома Паўлава. Падчас будаўніцтва дома на плошчы Перамогі яе заклалі ў будынак», — распавяла **вядучы навуковы супрацоўнік навукова-фондавага аддзела музея гісторыі Мінска Яўгенія СТАЛЬМАХАВА.**

«Наша сталіца, наша краіна — гэта шматнацыянальная супольнасць, вялікі наш дом, дзе кожны можа знайсці сваё месца, камфортна жыць і працаваць, — адзначыў **старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў Арцём ЦУРАН.** — Абсалютна не важна, хто ты па нацыянальнасці або па веравызнанні — кожны знаходзіць нашу краіну і сталіцу камфортнымі. Гэта мы паказалі сёння на сцэне. Немалаважна, што наш канцэрт завяршае праграму ўсіх рэгіёнаў. Мы ўдзячныя ім за тое, што яны падарылі мінчанам такія цудоўныя мерапрыемствы».

На яго думку, асноўная мэта такіх мерапрыемстваў — яднанне. «Мы паказалі, наколькі наш народ багаты ў частцы талентаў», — падагульніў дэпутат.

Як расказала **рэжысёр канцэрта, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Ніна ОСІПАВА,** «Мінск. Шляхамі мар і ўспамінаў» аб'яднаў каля 100 калектываў, амаль 1,5 тысячы артыстаў. «Гэта маштабны праект. Аматарскія і прафесійныя калектывы з радасцю прынялі ў ім удзел. Над канцэпцыяй думалі ўжо з пачатку года — чым можам здзівіць. У кожнай вобласці ёсць свае разыначкі, цікавыя моманты. Мінск — сучасны, вялізны горад. Ён заўсёды ў руху, у палёце. Так і з'явілася ідэя падарожжа па ім праз віртуальнае метро. У аснове — тэма адзінства», — падкрэсліла яна.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.

Пагадненні, кантракты, дамоўленасці

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У якасці кіраўніка беларускай часткі Рабочай групы па супрацоўніцтве Рэспублікі Беларусь з Іркуцкай, Арлоўскай, Пензенскай абласцямі Расійскай Федэрацыі падтрымліваю рабочыя кантакты з кіраўніцтвам названых рэгіёнаў. Можна гаварыць аб пэўных выніках перш за ўсё ў эканоміцы. Напрыклад, экспарт тавараў у Пензенскую вобласць з Брэсцкай дасягнуў 3,3 мільёна долараў за тры месяцы, што складае 194,2 працэнта ад паказчыка мінулага года, а ў Іркуцкую вобласць мы паставілі ў першым квартале тавараў на суму каля 805 мільёнаў долараў (тэмп росту — 109 працэнтаў).

Важна, што развіваюцца міжрэгіянальныя сувязі на самых розных кірунках: у галінах культуры, адукацыі, аховы здароўя. За апошні год Брэст прымаў дэлегацыі афіцыйных і дзелавых колаў з Іркуцкай, Пензенскай, Ленінградскай абласцей. Нашы медыкі таксама былі з візітам у Пензенскай вобласці. Ідзе плённае супрацоўніцтва паміж турыстычнымі арганізацыямі нашай вобласці і рэгіёнамі Расіі.

Варта сказаць, што Брэсцкая вобласць выступіла першым рэгіёнам, які прадставіў сваю экспазіцыю на Міжнароднай выставе-форуме «Расія» на ВДНГ у Маскве. Высокае прадстаўніцтва на ўрачыстым яе адкрыцці гаворыць аб важнасці і значнасці падзеі. Прэзентацыя Мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» выклікалі асаблівую цікавасць у наведвальнікаў. За тры тыдні наш павільён наведала вялікая колькасць гасцей.

Шырокі рэзананс атрымалі мерапрыемствы пад назвай «Пецярбургскія сустрэчы», якія прайшлі ў Брэсце 31 сакавіка — 1 красавіка. Прадстаўнікі расійскай дэлегацыі прынялі ўдзел у афіцыйных сустрэчах, арганізавалі вялікі канцэрт у Брэсцкім грамадска-культурным цэнтры, правялі семінары і майстар-класы ў спартыўных і культурных установах. Тыя мерапрыемствы атрымалі высокую ацэнку з боку жыхароў Брэста... Ад форуму ж чакаем новага імпульсу ў справе міжрэгіянальнага супрацоўніцтва.

— Выходзячы з таго, што Форум рэгіёнаў — аптымальная дыялогавая пляцоўка, падчас якой падпісваюцца дакументы аб супрацоўніцтве, раскажыце, якія пагадненні былі падпісаны Брэстчынай з расійскімі калегамі на мінулагоднім форуме. Які працяг атрымала супрацоўніцтва?

— Варта сказаць, што дэлегацыя Брэсцкай вобласці даволі плённа папрацавала на леташнім X Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі ва Уфе. Пералік усіх падпісаных дакументаў і дасягнутых дамоўленасцяў заняў бы шмат часу. Ёсць сэнс прывесці некаторыя прыклады з пераліку.

Планы мерапрыемстваў па гандлёва-эканамічным, навукова-тэхнічным, культурным супрацоўніцтве на тры гады, падпісаныя з адміністрацыямі Новасібірскай і Пензенскай абласцей, прадугледжваюць шэраг канкрэтных падзей. Заключаны важныя пагадненні па ўзаемадзеянні Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў з заканадаўчымі сходамі Калужскай і Пензенскай абласцей.

Брэсцкае аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты дамовілася аб сумесная рабоце з адпаведнымі арганізацыямі Саратаўскай, Самарскай, Ніжагародскай абласцей.

Падчас мерапрыемстваў быў падпісаны шэраг кантрактаў. Скажам, ТАА «АграХарчПрам» (Брэст) і «Нефцекамскі камбінат» дамовіліся аб пастаўцы абсталявання. Падобныя кантракты заключылі некалькі рэзідэнтаў СЭЗ «Брэст» з партнёрамі з Казані, Смаленска, іншых гарадоў РФ. Па выніках перагавораў было падпісана некалькі пратаколаў аб намерах. Пратакол аб намерах — першы важны крок да супрацоўніцтва. Скажам, у выніку рэалізацыі такога пратакола пачалася работа паміж Даманаўскім ПТК і «Салаватскім каталізатарным заводам» на прадмет экспартных паставак беларускага сілікату натрыю.

— Хто будзе прадстаўляць першы рэгіён на форуме ў Віцебскай вобласці? Якія планы? Магчыма, ёсць папярэднія дамоўленасці з суб'ектамі гаспадарання краіны-суседкі?

— Запланавана падпісанне шэрагу двухбаковых афіцыйных дакументаў. Напрыклад, тых, якія прадугледжваюць далейшае супрацоўніцтва паміж Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам і ўрадамі Пскоўскай вобласці, Прыморскага краю, Курскай, Ленінградскай, Арлоўскай, Саратаўскай абласцей, Рэспублікі Башкартастан. Прапрацоўваецца магчымасць падпісання пагадненняў аб устанаўленні пабрацімскіх сувязяў паміж гарадамі Брэст і Уладзівасток. Ганцавіцкі раён узгадняе з Муніцыпальным утварэннем «Бугроўскае сельскае пасяленне» Усяволжскага раёна Ленінградскай вобласці магчымасць падпісання дакументаў аб супрацоўніцтве. Такая ж работа праводзіцца паміж Іванаўскім раёнам Брэсцкай вобласці і Зарайскім раёнам Маскоўскай вобласці.

Прадстаўнікі Брэстчыны маюць намер прыняць самы актыўны ўдзел у рабоце секцый па медыцыне і фармацыі, па навуцы і адукацыі, тэхналогіях аграпрамысловага комплексу і лёгкай прамысловасці, культурна-гуманітарным супрацоўніцтве.

Скажам, у праграму работы адпаведнай секцыі ўключаны даклад рэктара Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта аб праектах лічбавага інжынірынгу. Універсітэт таксама збіраецца падпісаць пагадненне аб сумеснай рабоце з Самарскім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам, будзе разгледжана пытанне аб супрацоўніцтве з калегамі з Мардоўскага ўніверсітэта імя М. П. Агарова. Узаемадзеянне паміж вучонымі асабліва важнае ў наш час, бо пашырае магчымасці развіцця навукі і адукацыі.

Вялікія надзеі з форумам звязваюць суб'екты гаспадарання, у тым ліку прамысловыя прадпрыемствы. Так, Баранавіцкае баваўнянае аб'яднанне прапрацоўвае магчымасць падпісання экспартных кантрактаў з партнёрамі.

Варта сказаць, што форумы рэгіёнаў з'яўляюцца цудоўнай пляцоўкай для развіцця двухбаковага супрацоўніцтва і ў палітычнай, і ў эканамічнай сферы. Асабістыя сустрэчы, перагаворы дазваляюць выверыць пытанні супрацоўніцтва, накрэсліць перспектывы ўзаемадзеяння. Важнымі ўяўляюцца таксама прэзентацыі, выставы дасягненняў суб'ектаў гаспадарання, выступленні творчых калектываў. Такім чынам, кожны форум робіць сваю справу на шляху гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, а таксама сацыяльна-культурных адносін.

— Дарэчы, хто на гэты раз адказвае за культурны складнік праграмы ўдзелу Брэстчыны ў XI Форуме?

— Брэсцкую вобласць на XI Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі прадставіць Пінскі раён. На творчай лакацыі будзе сканцэнтравана разнастайнасць традыцыйнай народнай культуры палешукоў, паказана асаблівасць стылю сельскага жыцця і сялянскага побыту Палесся пад каларытнай назвай «Берасцейскае падворʼе».

У фармаце інтэрактыўнай прэзентацыі падрыхтавана знаёмства з унікальнай культурнай і традыцыйнай спадчынай Палесся ў жывым выкананні, таксама гаспадары падворка пачастуюць гасцей свята нацыянальнымі стравамі і напоямі, бульбянымі варэнікамі «Палюбзныкамі», драніканамі, бульбай са шкваркамі і медавухай.

Святочны настрой на пляцоўцы будуць задаваць музыканты Піншчыны: народны ансамбль народнай песні «Рабіначкі» Стыцычаўскага сельскага Дома культуры, дуэт выканаўцаў на народных інструментах «Доброславские зажигалочки», народны вакальны ансамбль «Явар ды каліна» Жабчыцкага сельскага Дома культуры.

У сувенірнай краме найлепшыя майстры Пінскага раённага Дома рамёстваў прапануюць вырабы традыцыйных відаў творчасці Палесся, майстар-класы па ткацтве, выцінанцы, ляльцы-матанцы, роспісе на шкле.

— Як вядома, складнікам форуму на гэты раз стане культурна-асветніцкі праект «Цягнік Памяці», ініцыяваны ў свой час кіраўнікамі верхніх палат парламентаў Беларусі і Расіі. «Цягнік» па традыцыі стартуе з Брэста. Наколькі значнай бачыцца гэтая падзея ў плане патрыятычнага выхавання моладзі і падрыхтоўкі да найважнейшай даты года — 80-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?

— Гэта вельмі важны, нават знакавы праект, у чым мы маглі ўпэўніцца за гады яго ажыццяўлення. Здаецца, лепшай магчымасці для стварэння ўмоў, здольных паспрыяць фарміраванню ў моладзі тых духоўных каштоўнасцяў, што будуць вызначаць мадэль далейшых жыццёвых паводзінаў, абуджаць інтарэс вывучаць і захоўваць гісторыка-культурную спадчыну, і не прыдумаеш. Удзел у праекце «Цягнік Памяці» дае магчымасць старшакласнікам знайсці аднадумцаў, з якімі яны раздзеляць гонар за сваю гісторыю, за подзвігі сваіх продкаў.

«Цягнік» традыцыйна стартуе з Брэста. І мы бачым, як гараць вочы гэтых хлопцаў і дзяўчат у пачатку падарожжа і як шчыра яны дзеляцца ўражаннямі па выніках паездкі. Заўсёды думаеш, што асаблівай падзякі заслугоўваюць аўтары ідэі «Цягніка Памяці», якія задумалі сабраць разам школьнікаў з пастсавецкай прасторы, каб даць ім магчымасць дакрануцца да гісторыі былой вялікай краіны, той краіны, якая перамагла ў Вялікай Айчыннай вайне.

Сёлета праект праходзіць у важны для Рэспублікі Беларусь год — 80-годдзе вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пры падрыхтоўцы нашых беларускіх удзельнікаў на гэтай найважнейшай даце рабіўся асаблівы акцэнт. Ад Брэсцкай вобласці сёлета ўдзел прымаюць восем вучняў 10-х класаў. А ўсяго ўдзельнікамі «Цягніка Памяці» стануць 200 хлопцаў і дзяўчат з васьмі краін. Урачысты старт, як ужо гаварылася, пройдзе на плошчы Цырыманіялаў Брэсцкай крэпасці 21 чэрвеня. Старшакласнікі атрымаюць магчымасць паўдзельнічаць у традыцыйных ранішніх жалобных мерапрыемствах, прысвечаных Дню ўсенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа, пабачыць гістарычную рэканструкцыю падзей першага дня вайны. Як паказвае практыка, ноч і ранак у крэпасці пакідаюць незабыўныя ўражанні ва ўсіх, хто там бывае. Спадзяёмся, што запомняцца яны і ўдзельнікам праекта. Ну а потым мы з задавальненнем сустрэнемся з імі на Віцебшчыне, на Форуме рэгіёнаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Мексіка рыхтуецца да эканамічнай нестабільнасці ў ЗША

Мексіка рыхтуецца да таго, што ў ЗША пасля выбараў кіраўніка дзяржавы восенню гэтага года можа ўзнікнуць эканамічная нестабільнасць. Пра гэта заявіў прэзідэнт Мексікі Андрэс Мануэль Лопес Абрадор, паведаміла ТАСС. «Неабходна дзейнічаць прадбачліва, прымаючы да ўвагі выбары ў ЗША», — сказаў ён, указваючы на тое, што пасля выбараў у ЗША можа ўзнікнуць фінансавая або эканамічная нестабільнасць. «Як гэта часам адбываецца, калі прыходзяць новыя ўрады, яны пачынаюць праводзіць палітыку эканамічных пераўтварэнняў. І гэтыя пераўтварэнні ўплываюць. Калі гаворка ідзе пра ЗША, ўплываюць на ўвесь свет», — адзначыў Андрэс Мануэль Лопес Абрадор. Ён дадаў, што ў першую чаргу змены паўплываюць на Мексіку як ключавога гандлёвага партнёра ЗША.

Улады Германіі папярэджваюць аб магчымым тэракце на Еўра-2024

Улады Германіі на фоне чэмпіянату Еўропы па футболе папярэдзілі аб магчымых тэрактах у Еўропе, па маштабе параўнальных з нападам на канцэртную залу «Крокус Сіці Хол». Аб гэтым паведаміла ТАСС газета Financial Times. Міністр унутраных спраў Германіі Нэнсі Фезер паведаміла, што Еўропа, у прыватнасці Германія, знаходзіцца пад прыцэлам джыхадысцкіх арганізацый. Па словах кіраўніка Федэральнага ведамства па ахове Канстытуцыі ФРГ Томаса Хальдэнванга, адным з магчымых сцэнарыяў можа быць буйнамаштабная скаардынаваная атака па прыкладзе тэракта ў Маскве, які нядаўна адбыўся. FT паведамляе, што папярэджанне было агучана на фоне правядзення чэмпіянату Еўропы па футболе, які праходзіць да 14 ліпеня ў ФРГ.

Экаактывісты распылілі аранжавую фарбу на Стоўнхэндж

Актывісты экалагічнага руху Just Stop Oil распылілі аранжавую фарбу на камяні Стоўнхэнджа для прыцягнення ўвагі да тэмы абароны навакольнага асяроддзя, паведаміла ТАСС. У сацсетцы руху перадаецца, што два чалавекі паўдзельнічалі ў гэтай акцыі з патрабаваннем ад будучага ўрада падпісаць юрыдычна абавязвальную дамову аб паэтапнай адмове ад выкапнёвага паліва да 2030 года. Такім чынам актывісты звярнуліся да апазіцыйнай Лейбарысцкай партыі Вялікабрытаніі, якая можа змяніць кансерватараў. Паліцыя графства Уілтшыр пазней паведаміла, што экаактывісты былі затрыманы. Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Рышы Сунак назваў падзею ганебным актам вандалізму ў адносінах да аднаго з найважнейшых помнікаў краіны.

ПАРТЫЗАНСКІ ЎНЁСАК У «БАГРАЦІЁН»

Беларуская наступальная аперацыя пачалася 80 гадоў таму, 23 чэрвеня 1944 года

Уклад беларускіх партызан у Вялікую Перамогу — беспрэцэдэнтны факт не толькі ў гісторыі нашай краіны, але і ўсяго свету. Усенародны партызанскі рух, які разгарнуўся на тэрыторыі Беларусі ў гады акупацыі, калі на абарону Айчыны сталі і старыя, і жанчыны, і дзеці, з'яўляецца ўнікальнай старонкай у гісторыі нашай шматпакутнай краіны. У гады Вялікай Айчыннай вайны былі створаны 213 партызанскіх брыгад і 258 асобных атрадаў, з акупантамі гераічна змагалася звыш 374 тысяч народных мсціўцаў. За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў барацьбе з нямецкімі акупантамі, больш за 140 тысяч партызан і падпольшчыкаў Беларусі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Савецкага Саюза. Найвышэйшага звання былі ўдастоены каля ста народных мсціўцаў.

Істотную ролю партызаны адыгралі ў працэсе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Асаблівасцю Беларускай наступальнай аперацыі «Багацыён», у ходзе якой наша краіна была поўнасцю вызвалена, стала баявое ўзаемадзеянне партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Да пачатку лета 1944 года на беларускай зямлі, у тыле ворага, дзейнічала каля 143 тысяч партызан. Баявыя дзеянні партызан Беларусі атрымалі высокую ацэнку савецкага камандавання. Усе задачы, пастаўленыя перад народнымі мсціўцамі Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання, былі паспяхова выкананы. Як і задумвалася, партызаны дэзарганізоўвалі сапернікa, зрывалі падвоз яго рэзерваў да лініі фронту, перашкаджалі аператыўнаму перакідванню войскаў паміж франтамі.

З якімі яшчэ задачамі ў гэты найскладанейшы перыяд даводзілася спраўляцца народным мсціўцам, удалося даведацца дзякуючы архіўным дакументам Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Яшчэ не так даўно шэраг аператыўных зводак Беларускага штаба партызанскага руху захоўваўся пад грыфам «сакрэтна» або «зусім сакрэтна». Цяпер гэтая найкаштоўнейшая інфармацыя — у адкрытым доступе.

«Мацней удары па нямецкіх акупантах!»

Задачы партызан у сувязі з надыходзячым вызваленнем Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў за подпісам першага сакратара ЦК КП(б) Беларусі П. Панамарэнкі яшчэ 23 мая 1944 года былі сфармуляваны ў адпаведнай дырэктыве. Народным мсціўцам загадвалася ўзмацніць удары па камунікацыях і ваенных аб'ектах праціўніка, чыгуначных станцыях, мастах, выводзіць са строю дзеючыя ў іх інтарэсах прадпрыемствы, не даваць немцам вывозіць у Германію нарабаваную маёмасць. Ставілася задача ўсімі мерамі і сродкамі імкнуцца захаваць гарады, сельскія населеныя пункты, прадпрыемствы, жылыя і грамадскія будынкі ад разбурэння немцамі.

Узмацняць барацьбу з праціўнікам у сувязі з пачаткам аперацыі па вызваленні Беларусі было даручана і моладзі. «Цяпер, калі ідуць вырашальныя бітвы за поўны разгром ворага, ад вас патрабуецца ўсямернае ўзмацненне баявой актыўнасці, самаахвярная дапамога Камуністычнай партыі балышавікоў Беларусі ў яе гераічнай рабоце па мабілізацыі ўсіх сіл народа на актыўную барацьбу супраць нямецкіх катаў, на знішчэнне акупантаў, якія адступаюць, іх баявой тэхнікі, на ўсямерную дапамогу Чырвонай Арміі, якая адступае, — сказана ў звароце 5-га пленума ЦК ЛКСМБ да моладзі Беларусі. — Мацней удары па нямецкіх акупантах! Біце іх усюды, усімі сіламі разбурайце шляхі іх адступлення, не давайце немцам разбураць і паліць нашы гарады і сёлы, знішчайце атрады падпальшчыкаў, ратуйце насельніцтва ад знішчэння немцамі і ўгону на фашысцкую катаргу. З прыбліжэннем часцей Чырвонай Арміі ўступайце з імі ў сувязь і дапамагайце ўсім, чым можаце...»

Партызаны з усёй адказнасцю паставіліся да даручаных ім задач. У загадзе Асіповіцкага падпольнага райкама КП(б)Б і камандавання Асіповіцкай ваенна-аператыўнай групы сказана асноўную ўвагу ў баявой дзейнасці атрадаў у цяперашні час удзяліць разведцы, арганізаваць сістэматычнае назіранне за гарнізонамі і ўсялякімі змяненнямі, якія ў іх адбываюцца. Разведкам пастаўлена задача дакладна ўстанаўліваць колькасць і нумарацыю часцей, якія адступаюць. Для гэтага дазвалялася выкарыстоўваць усе сродкі, галоўным чынам, захоп «языка». Даручалася ствараць спецыяльныя дывер-

сійныя групы для мініравання шашэйных і грунтовых дарог, ударныя групы для арганізацыі засад з мэтай знішчэння дробных груп і захопу «языкоў».

Звяртаючыся да камандзіраў і камісараў партызанскіх брыгад, сакратароў падпольных абкамаў і райкамаў КП(б)Б, усіх партызан і партызанак у сувязі з вызваленнем Беларусі, П. Панамарэнка адзначаў, што доблесныя беларускія партызаны і партызанкі аказвалі і аказваюць Чырвонай Арміі вялізную дапамогу ў барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Цяпер, калі разгортваюцца вырашальныя бітвы за поўны разгром ворага, больш чым калі-небудзь патрабуецца ўзмацніць баявую актыўнасць усіх партызан і партызанак, каб сумеснымі ўдарамі Чырвонай Арміі з фронту і партызан з тылу дабіць нямецкіх захопнікаў і наблізіць дзень нашай поўнай перамогі, — сказана ў звароце. — Цэнтральны Камітэт КП(б)Б і ўрад БССР заклікаюць усіх партызан і партызанак выканаць да канца сваю вялікую ролю народных мсціўцаў і мабілізаваць усе сілы для аказання дапамогі пераможным войскам наступальнай Чырвонай Арміі».

«Ні аднаго немца не выпусцім з беларускай зямлі»

Усё новыя і новыя гарады вызваляць чырвонаармейцам дапамагалі партызаны. «Чырвоная Армія бесперапынна гоніць немцаў на захад, не дае ім перадышкі, не дае ім магчымасці астанавіцца (даслоўна. — **«Зв»**.), — сказана ў звароце Ляхавіцкага падпольнага райкама КП(б)Б да працоўных Ляхавіцкага раёна ад 29 чэрвеня 1944 года. — У выніку такога маланкавага ўдара немцы не паспяваюць адступаць. Так, у раёне горада Віцебска 26 чэрвеня было акружана 5 пяхотных дывізій немцаў. Па выпадку адказа папаўшых у акружэнне здацца ў палон, групоўка была знішчана. Налічана больш 20 тысяч трупаў немцаў. Толькі апошнія 10 тысяч склалі зброю і здаліся ў палон».

Паведамляецца, што 27 чэрвеня 1944 года было акружана пяць варожых дывізій у раёне Бабруйска. У баях за Магілёў разгромлена 12-я пяхотная дывізія немцаў, камандзір якой генерал-лейтэнант Бамлер узяты ў палон разам з яго штабам. Таксама ў палон трапіў камендант Магілёва генерал-маёр Эрдмансдорф. У звароце даюцца парады насельніцтву: закопваць маёмасць, уганяць у лясы жывёлу, уцякаць бліжэй у лясы да размяшчэння партызанскіх атрадаў.

«Час помсты настаў! — сказана ў партызанскім звароце да працоўных Ляхавіцкага раёна. — Працоўныя Ляхавіцкага раёна, актыўней супрацоўнічайце з партызанамі і часцямі Чырвонай Арміі. Усюды падсцерагайце гадаў немцаў, дзе яны будуць імкнуцца паліць нашы вёскі, грабіць і знішчаць маёмасць. Сачыце за немцамі, за мініраваннем дарог, мастоў і будынкаў. Бесперапынна, на кожным кроку, знішчайце і біце агідных немцаў. Ні аднаго немца не выпусцім з беларускай зямлі. Смерць і праклятце нямецка-фашысцкім захопнікам!»

З мэтай абароны насельніцтва партызаны злучэння Мінскай вобласці пад камандаваннем І. Бельскага пад моцным прыкрыццём у раёне в. Мецявічы праз раку Случ пабудавалі паром, па якім у лес перапраўлялі насельніцтва, скаціну, маёмасць. У ноч на 30 чэрвеня брыгады планавалі засяродзіцца на подступах да Старобіна, каб штурмаваць яго з мэтай захопу.

«Вяду баі, затрымліваю рух праціўніка па бальшаках і дарогах»

Выконваючы абавязкі камандзіра партызанскага злучэння «Трынаццаць» Магілёўскай вобласці, С. Пахомаў 30 чэрвеня дакладваў начальніку опергрупы БШПР на 3-м Беларускім фронце А. Архангельскаму, што яго падраздзяленне злучылася з Чырвонай Арміяй. «Вяду баі, затрымліваю рух праціўніка па бальшаках і дарогах, — паведамляе Пахомаў. — Генерал Файфер падарваны ў танку, забіты. Яго ўзнагароды і знакі адрознення знаходзяцца ў мяне. Дакументы і абмундзіраванне яго згарэлі. Асоба генерала ўстаноўлена апытаннем імяннога кіроўцы танка і з канвою генерала».

Камандзір партызанскага атрада «За Савецкую Беларусь» дакладваў у штаб Асіповіцкага партызанскага злучэння аб тым, што за тры дні, з 28 да 30 чэрвеня 1944 года, народныя мсціўцы знішчылі восем паліцэйскіх, 358 нямецкіх салдат і афіцэраў, параніліі ўзялі ў палон 28 нямецкіх ваеннаслужачых. За аналагічны перыяд партызанская брыгада Блохіна на Крулеўшчызненскім напрамку разграміла 601-ы полк 201-й ахоўнай дывізіі ворага. Народныя мсціўцы забілі і нанеслі раненні 375 салдатам і афіцэрам Вермахта, узялі ў палон 36 салдат і трох афіцэраў. У ноч на 29 чэрвеня партызаны брыгады Кухарэнкі на чыгункі Полацк — Дзвінск пусцілі пад адхон эшалон праціўніка, а брыгады Грыгор'ева ў ноч на 1 ліпеня ўзарвала масты на шашы Полацк — Клясціцы і Задзеж'е — Дзярновічы.

Сіламі ваенна-аператыўнай групы пры Бялыніцкім РК КП(б)Б у выніку бою з гітлераўцамі 28 і 29 чэрвеня знішчылі 11 аўтамашын, падбілі танкетку, фургон і два матацыклы, забілі каля сотні нямецкіх салдат, аднаго ўзялі ў палон. У баі ў ноч на 30 чэрвеня партызаны таксама рашуча расправіліся з сіламі ворага і яго тэхнікай, а самае галоўнае, выратавалі ад угону ў Германію каля тысячы мірных грамадзян. Такіх паведамленняў, дзе камандзіры партызанскіх фарміраванняў рапартуюць аб сваіх поспехах, у Нацыянальным архіве захоўваецца нямала.

У сувязі з поўным вызваленнем Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў, якое пачалося 4 ліпеня 1944 года, СНК БССР, Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР і ЦК КП(б)Б звярнуліся да беларускага народа са словамі прывітання і баявога заклiку. Асаблівыя словы ўдзячнасці ў звароце былі адрасаваны партызанам: «Партызанскі рух у Беларусі стаў усенародным. Ад краю да краю па загадзе таварыша Сталіна, пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі з першых дзён Айчыннай вайны падняўся са зброяй у руках беларускі народ супраць ненавісніцкіх нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтая барацьба найярчэйшай старонкай увойдзе ў гісторыю Айчыннай вайны як бяспрыкладны подзвіг народа ў імя і ў славу сваёй Радзімы».

Так і атрымалася. Нягледзячы на тое, што 3 ліпеня Мінск быў вызвалены, выгнанне нямецка-фашысцкіх захопнікаў з беларускай зямлі працягвалася. Народныя мсціўцы дапамагалі рэгулярным часцям набліжаць Вялікую Перамогу.

Вераніка КАНЮТА,
Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ,
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Беларусі.
Фота з адкрытых крыніц.

ЧАМУ ЗАСНАВАНЫ МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ ДЫЯЛОГУ ПАМІЖ ЦЫВІЛІЗАЦЫЯМІ?

Распавёў «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн

— 7 чэрвеня 78-я Генеральная Асамблея ААН аднагалосна адобрыла рэзалюцыю аб заснаванні Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі, якая была прапанавана Кітаем, абвясціўшы 10 чэрвеня Міжнародным днём дыялогу паміж цывілізацыямі, — адзначыў кіраўнік дыпламатычнай місіі. — Дадзеная рэзалюцыя атрымала захопленыя водгукі і шырокую падтрымку з боку міжнароднай супольнасці. Усяго 15 краін удзельнічалі ў рабоце асноўнай групы па падрыхтоўцы рэзалюцыі, а 83 дзяржавы, уключаючы Беларусь, прынялі ўдзел у сумесным падпісанні.

Міжнародныя арганізацыі, такія як Альянс цывілізацый Арганізацыі Аб'яднаных Нацый і ЮНЕСКА, прывіталі і падтрымалі прыняцце рэзалюцыі. Многія дзеячы міжнароднай супольнасці таксама выказалі сваю высокую адзнаку. Лічыцца, што рэзалюцыя глыбока адпавядае агульнаму імкненню міжнароднай супольнасці да гарманічнага суіснавання і ўзаемнавучання розных цывілізацый, а таксама прыўнясе пазітыўную энергію ў падтрыманне міру ва ўсім свеце і садзейнічанне агульнаму развіццю.

Устанаўленне Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі з'яўляецца яшчэ адной важнай грамадскай выгодай, прадстаўленай Кітаем міжнароднай супольнасці, якая дапамагае засяродзіцца на тэме дыялогу паміж цывілізацыямі, ухіляе сутыкненні, спрыяе ўзаемнаму навучанню, умацоўвае кансэнсус паміж цывілізацыямі і спрыяе развіццю і прагрэсу глабальнай цывілізацыі. У той час, калі шматлікія крызісы і выклікі цесна пераплецены і свет уступае ў новы перыяд узрушэнняў і перамен, можна сказаць, што гэтая падзея з'яўляецца своечасовай, доўгачаканай і мае вялікае значэнне.

Па-першае, заснаванне Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі наводзіць міжнародную супольнасць на пераадоленне рознагалоссяў. Цяпер у свеце адбываюцца нябачаныя за стагоддзе вялікія перамены, з кожным днём нарастаюць геапалітычныя супярэчнасці, адзін за адным узнікаюць рэгіянальныя канфлікты. Дыялог паміж цывілізацыямі з'яўляецца эфектыўным сродкам і адзіным спосабам выкараніць дыскрымінацыю і забабоны, палепшыць паразуменне і давер, умацаваць сувязі паміж народамі, а таксама ўзмацніць згуртаванасць і супрацоўніцтва. Кітайскі бок нязменна актыўна імкнецца да дасягнення мірнага кансэнсусу з дапамогай дыялогу і выступае за тое, каб з дапамогай абменаў пераадольваць раз'яднанасць паміж цывілізацыямі, праз узаемнавучанне пераадольваць сутыкненні паміж цывілізацыямі і з дапамогай суіснавання пераадольваць іх перавагу. Міжнародны дзень дыялогу паміж цывілізацыямі заклікае да павагі іх разнастайнасці, увасабляе канцэпцыю цывілізацыі аб роўнасці, узаемным навучанні, дыялогу і інклюзіўнасці, адлюстроўвае ідэі багатай традыцыйнай культуры Кітая, такія як узаемная павага, інклюзіўнасць і ўзаемавучанне, гарманічнае суіснаванне, а таксама з'яўляецца натхненнем для краін усяго свету да вырашэння рознагалоссяў мірным шляхам урэгулявання канфліктаў праз дыялог і кансультацыі.

Па-другое, заснаванне Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі стварае карысную платформу для абменаў, узаемнага навучання, спадчыны і інавацый паміж рознымі цывілізацыямі. У сучасным свеце шляхі мадэрнізацыі з рознымі характарыстыкамі ў розных краінах і рэгіёнах свету зыходзяць з багатай і разнастайнай цывілізацыйнай спадчыны, якая бярэ пачатак са старажытных часоў. Сёння, калі будучыня і лёс усіх краін цесна звязаны, інклюзіўнае суіснаванне, абмены і ўзаемнае навучанне розных цывілізацый адыгрываюць незаменную ролю ў садзейнічанні працэсу мадэрнізацыі чалавечага грамадства і росквіту сусветнага сада цывілізацый. Прапанова кітайскага боку заснаваць Міжнародны дзень дыялогу паміж цывілізацыямі накіравана на павышэнне дасведчанасці ўсяго свету аб разнастайнасці цывілізацый і важнай каштоўнасці абменаў і супрацоўніцтва паміж імі, падахвочвае розныя цывілізацыі інтэграваць свае моцныя бакі з дапамогай абменаў, дыялогу і запазычання вопыту адзін у аднаго, а таксама дазваляе старажытным цывілізацыям, карыстаючыся вопытам папярэдніх пакаленняў і ідучы ў нагу з часам, заззяць новай жыццёвай сілай і рэалізаваць агульны росквіт.

Па-трэцяе, заснаванне Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі дае ўнікальную магчымасць краінам усяго свету аб'яднаць намаганні для рэагавання на глабальныя выклікі. Цяпер свет сутыкаецца з шырокім спектрам глабальных праблем, якія становяцца ўсё больш сур'ёзнымі і складанымі. Дэфіцыт міру, бяспекі, развіцця і кіравання толькі нагічнай разнастайнасці. Ніводная краіна не можа справіцца з імі ў адзіночку, неабходна разам пераадольваць выклікі, умацоўваць згуртаванасць, супрацоўнічаць, неабходна выпрацаваць агульны кансэнсус з дапамогай абменаў і ўзаемнага навучання паміж цывілізацыямі, чэрпаць мудрасць і падтрымку ў розных цывілізацый, сумесна шукаць шляхі вырашэння выклікаў. У верасні гэтага года Арганізацыя Аб'яднаных Нацый правядзе Саміт будучыні, на якім будуць прапанаваны сістэматызаваныя адказы на бягучыя выклікі. У гэты важны гістарычны момант Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб заснаванні Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі, накіраваўшы пазітыўны сігнал у падтрымку дыялогу паміж цывілізацыямі і заахвочвання абменаў і ўзаемнага навучання паміж імі, што таксама мае асабліва важнае значэнне для ўдасканалення глабальнага кіравання і сумеснага супрацьстаяння выклікам.

Нарэшце, заснаванне Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі азначае далейшае ўкараненне Ініцыятывы аб глабальнай цывілізацыі, вылучанай Кітаем. 15 сакавіка мінулага года падчас Дыялогу высокага ўзроўню паміж Камуністычнай партыяй Кітая і палітычнымі партыямі свету Старшыня Сі Цзіньпін урачыста вылучыў Ініцыятыву аб глабальнай цывілізацыі і звярнуўся да сусветнай супольнасці са шчырым заклікам да далейшага развіцця абменаў і ўзаемнага навучання паміж цывілізацыямі і прасоўвання прагрэсу чалавецтва. Ініцыятыва атрымала шырокае прызнанне і актыўны водгук міжнароднай супольнасці. Рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі ААН аб заснаванні Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі бярэ ў якасці асноўнай лініі сутнасць «чатырох прапаноў» Ініцыятывы глабальнай цывілізацыі, заклікае ўсе бакі праводзіць яркія і маляўнічыя святочныя мерапрыемствы з нагоды Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі, выступаць за павагу іх разнастайнасці, надаваць важнае значэнне спадчыне і інавацыям, актыўна заахвочваць гуманітарныя абмены і супрацоўніцтва. Дадзеная рэзалюцыя прыўнясе моц цывілізацый у адзінства і прагрэс чалавецтва і паслужыць устойлівым стымулам для дасягнення агульнага росквіту. Міжнародная супольнасць аднагалосна падтрымлівае ўстанаўленне Генеральнай Асамблеяй ААН Міжнароднага дня дыялогу паміж цывілізацыямі, што яшчэ раз у поўнай меры дэманструе: Ініцыятыва глабальнай цывілізацыі адпавядае павевам часу і адпавядае патрэбам эпохі, а таксама ў поўнай меры дэманструе: яе асноўныя каштоўнасці атрымліваюць усё большую падтрымку.

Асабліва важна адзначыць, што гуманітарнае супрацоўніцтва з'яўляецца неад'емнай часткай кітайска-беларускіх адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства. Нашы адносіны можна смела назваць узорам дыялогу, абмену, інклюзіўнасці і ўзаемнавучання паміж цывілізацыямі. Практыка гуманітарнага супрацоўніцтва паміж Кітаем і Беларуссю ў поўнай меры даказала, што дыялог паміж цывілізацыямі і культурныя абмены з'яўляюцца важным мостам для паглыблення ўзаемаразумення і даверу паміж народамі ўсіх краін, а таксама выдатным каналам для цывілізацый усіх краін, якія дазваляюць вучыцца адна ў адной усяму лепшаму і ісці ў нагу з часам. Зазіраючы ў будучыню, кітайскі бок гатовы прыкладаць намаганні разам з міжнароднай супольнасцю, уключаючы Беларусь, у яркім і маляўнічым фармаце адзначаць Міжнародны дзень дыялогу паміж цывілізацыямі, глыбока ажыццяўляць Ініцыятыву глабальнай цывілізацыі, гатовы дабівацца салідарнасці, цярпіма ставячыся да адрозненняў, імкнуцца да аднадушнасці, паважаючы адрозненні ўсіх бакоў з тым, каб прыкладаць намаганні для ўсебаковага развіцця гуманітарных абменаў, культурнай інтэграцыі і сувязі паміж народамі краін свету, а таксама поплеч ствараць новы раздзел у пабудове Супольнасці адзінага лёсу чалавецтва.

Падрыхтаваў Мікалай ЛІТВІНАЎ.

❍ **Даслоўна**

«Адказнасць у век беспрэцэдэнтных перамен»

Пастаянны прадстаўнік КНР пры ААН Фу ЦУН прадставіў праект рэзалюцыі на пленарным пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН, паведаміла «Сіньхуа». Ён заявіў, што ў цяперашніх умовах шматлікія крызісаў і выклікаў свет уступіў у новы перыяд нестабільнасці і перамен, зноў паставіўшы чалавецтва на скрыжаванне гісторыі. На гэтым фоне Кітай прапанаваў заснаваць Міжнародны дзень дыялогу паміж цывілізацыямі. Гэтая ініцыятыва прыўносіць пазітыўную энергію ў глабальныя намаганні па вырашэнні агульных праблем. Рэзалюцыя дэманструе «цвёрдую падтрымку прынцыпу мультылатэралізму» і падкрэслівае адказнасць Кітая як буйной дзяржавы ў век беспрэцэдэнтных перамен, адзначыў Фу Цун.

— Калі вы паглядзіце на сучасны свет, то ўбачыце мноства спрэчак, канфліктаў, нават войнаў. Адсутнасць талерантнасці, экстрэмізм і папулізм — усё гэта вельмі актуальныя праблемы. Іх корань — у адсутнасці паразумення паміж прадстаўнікамі розных культур і рэлігій, — падкрэсліў Пастаянны прадстаўнік КНР пры ААН. — На наш погляд, вельмі важна абапірацца на паняцце цывілізацыі, каб вырашыць гэтую праблему».

Ірына СТАРАВОЙТАВА:

«ЗА ГАДЫ СУВЕРЭНІТЭТУ Ў БЕЛАРУСІ СФАРМІРАВАЛАСЯ СВАЯ ШКОЛА СТВАРЭННЯ ПАДРУЧНІКАЎ»

Прынятая ў Беларусі канцэпцыя развіцця сістэмы адукацыі, вядома, найперш вызначае дзяржаўную палітыку ў гэтай сферы. Не менш важнае значэнне надаецца і механізмам яе рэалізацыі. Размова ідзе ў тым ліку аб падрыхтоўцы, абнаўленні і ўкараненні ва ўстановах адукацыі праграм па вучэбных прадметах, выданні вучэбна-метадычнай літаратуры і іншым — усім тым, што сёння складае дзейнасць ДУА «Акадэмія адукацыі». Якія пытанні вырашаюцца падчас гэтай дзейнасці, што зроблена, а што ў найбліжэйшых планах, распавядае рэктар акадэміі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Ірына Старавойтава.

— Ірына Анатольеўна, Акадэмія адукацыі — вельмі маладая структура. Невялікі экскурс у яе гісторыю, знаёмства з мэтамі, задачамі і перспектывамі будзе цікавае нашым чытачам.

— Акадэмія ўтварылася ў выніку зліцця навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Беларусі і дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі». Найважнейшымі мэтамі дзейнасці арганізацыі з'яўляюцца навукова-метадычнае забеспячэнне сістэмы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі, дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, дадатковай адукацыі дарослых, а таксама ўдасканаленне і развіццё дадатковай адукацыі дарослых Рэспублікі Беларусь на аснове сучасных дасягненняў і практыкі. Акадэмія адукацыі аб'яднала, па сутнасці, функцыі дзвюх устаноў.

— Калі можна, падрабязней аб дзейнасці вашай установы.

— Мы праводзім фундаментальныя і прыкладныя навуковыя даследаванні ў сферы педагогікі, методыкі навучання вучэбным прадметам, ажыццяўляем навукова-метадычнае суправаджэнне эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ва ўстановах адукацыі, вывучаем якасць дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі. На працягу года ў нас праходзяць павышэнне кваліфікацыі больш як 5000 кіраўнікоў установ, педагогі, кіраўнікі метадычных аб'яднанняў. У міжкурсавы перыяд мы арганізоўваем канферэнцыі, семінары, вэбінары, практыкумы, нарады, як у вочным, так і анлайн-фармаце. Акадэмія ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць: выпускаем часопісы — «Веснік адукацыі» і «Педагагічная навука і адукацыя». Дарэчы, абодва часопісы ўваходзяць у пералік выданняў, рэкамендаваных ВАК для публікацыі вынікаў дысертацыйных даследаванняў. Выдаём таксама наш акадэмічны зборнік навуковых прац і зборнік нарматыўных дакументаў Міністэрства адукацыі.

У лабараторыях навукова-даследчага цэнтра акадэміі працуюць пяць дактароў і 18 кандыдатаў навук. Прафесарска-выкладчыцкі склад уключае чатыры дактары і 17 кандыдатаў навук. 90 чалавек навучаюцца ў аспірантуры нашай установы.

— Задач у калектыву шмат. Але давайце спынімся на тых, якія найбольш цікавяць настаўнікаў, вучняў, іх бацькоў, — школьных падручніках і навучальных праграмах. Мала хто з неспецыялістаў ведае, як ствараецца падручнік...

— Шлях дастаткова доўгі і складаны. Для таго, каб стаць падручнікам, матэрыялы, падрыхтаваныя аўтарамі, праходзяць шмат этапаў экспертызы, абмеркаванняў на дыялогавых пляцоўках з педагогамі, узгадненняў, апрабацыю ва ўстановах адукацыі. Па выніках такой работы да падручніка не павінна быць якіх-небудзь сур'ёзных прэтэнзій або нязгоды з боку экспертаў — усе водгукі павінны быць станоўчымі.

— Дзе і якім чынам апрабоўваюць школьныя падручнікі?

— Апрабацыя праходзіць ва ўстановах адукацыі, ва ўмовах рэальнага адукацыйнага працэсу. Пералік школ мы вызначаем сумесна з Міністэрствам адукацыі.



Фота Лізаветы ГОЛАД.

— А чаму не ўзяць любую з іх?

— Аддаючы падручнік на апрабацыю, мы павінны быць упэўненымі ў высокім узроўні кваліфікацыі педагогаў, якія прафесійна правядуць працэдуру і дадуць такое ж прафесійнае заключэнне. Бо вырашаецца лёс навучальнага дапаможніка, паводле якога будуць вучыцца сотні тысяч дзяцей.

Так, напрыклад, падручнік «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» для 10 класа праходзіў апрабацыю менавіта такім чынам. Але вы маеце рацыю: межы так званых выпрабаванняў трэба пашыраць. Таму актыўна рэалізоўваем такую форму абмеркавання, як дыялогавая пляцоўка, куды запрашаем педагогаў, метадыстаў, пры гэтым кожны з удзельнікаў пляцоўкі можа выказаць сваю пазіцыю, унесці прапановы па ўдасканаленні навучальнага дапаможніка. Натуральна, што да працэсу падрыхтоўкі і выдання падручніка мы прыцягваем і рэцэнзентаў, і экспертаў — гэта могуць быць прадстаўнікі грамадскасці, спецыялісты з розных сфер, якія паглядзяць і ацэняць як у цэлым змест падручніка, так і асобныя пытанні, напрыклад метадычны, паняційны, ілюстрацыйны апараты, пытанні адпаведнасці зместу падручніка ўзросту дзіцяці і гэтак далей. Ёсць яшчэ бацькі і навучэнцы, меркаванне якіх мы таксама ўлічваем. Пры Міністэрстве адукацыі працуе грамадска-кансультатыўны савет, дзе абмяркоўваюцца актуальныя пытанні сістэмы адукацыі, у тым ліку і асобныя новыя навучальныя выданні. Кожны падручнік праходзіць праз пэўнае кантрольнае сіта — секцыю і прэзідыум Навукова-метадычнага савета пры Міністэрстве адукацыі, а падручнікі па вучэбных прадметах сацыяльна-гуманітарнага кірунку — праз секцыю і бюро спецыяльна створанай Дзяржаўнай камісіі.

— Працэс сапраўды складаны і шматгранны.

— Можна сказаць, што за гады суверэнітэту Беларусі ў нас сфарміравалася свая школа стварэння падручнікаў для беларускай школы. Выбудоўванне гэтых працэсаў ішло няпроста, але можна ўпэўнена сказаць, што нашы падручнікі вельмі цікавыя, у тым ліку і калегам з іншых краін. Дарэчы, усе падручнікі размешчаны ў адкрытым доступе на нацыянальным адукацыйным партале.

— Цяпер, дзякуючы вашаму грунтоўнаму расповеду, мы ведаем, як ствараюць падручнікі. Настала чарга даведацца, хто іх стварае.

— У склад аўтарскіх калектываў уваходзяць навукоўцы, метадысты і вопытныя настаўнікі-практыкі. Функцыі вучоных — сфарміраваць змест падручніка, заснаваны на прынцыпах навуковасці. Метадыст і настаўнік-практык добра ведаюць, які матэрыял неабходны для пэўнага ўзросту і ў якой форме лепш за ўсё яго прадставіць. У сучасных беларускіх падручніках шмат новых метадычных знаходак, якія дазваляюць вучню лягчэй зразумець і асвоіць той ці іншы матэрыял.

— Ірына Анатольеўна, вы і навуковец, і практык — педагог з вялікім стажам. Якім, на вашу думку, павінен быць у ідэале падручнік для сучаснага школьніка?

— Перад намі заўсёды стаяла і стаіць задача зрабіць падручнік зразумелым. У ім павінны гарманічна спалучацца навуковасць і даступнасць выкладу. І ўсё гэта — адпавядаць узросту дзіцяці, яго пазнавальным магчымасцям.

У навучальным матэрыяле павінны прысутнічаць лагічнасць, паслядоўнасць выкладу і бесперапыннасць вывучэння матэрыялу. Маё цвёрдае перакананне — любы падручнік павінен мець выхаваўчы патэнцыял, які адлюстроўвае тыя прынцыповыя сутнасныя паняцці, якія вельмі важныя для фарміравання асобы: любоў да Радзімы, да сям'і, да прыроды і гэтак далей.

Мы — педагогі, і нам даверана найважнейшая місія — фарміраваць светапогляд дзіцяці, бо ён выбудоўваецца ў тым ліку і праз змест падручніка. Тут, вядома, вялікая роля і педагога, яго асобы. Калі ж казаць аб задачах навучальнага працэсу ў прыватнасці і адукацыі ў цэлым, то тут павінен працаваць прынцып трыадзінства: выхаванне, навучанне і развіццё. Пры гэтым выхаванне заўсёды ставіцца на першае месца, і мы ніколі не адыходзілі ад гэтых прынцыпаў.

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Яшчэ адно маё цвёрдае перакананне — адукацыя, у тым ліку і змест навучальных матэрыялаў, павінны быць практыка-арыентаванымі. У лабараторыях акадэміі былі распрацаваны метадалагічныя і тэарэтычныя асновы фарміравання функцыянальнай пісьменнасці навучэнцаў, на аснове якіх створаны вучэбна-метадычныя комплексы факультатыўных заняткаў. Адпаведныя заданні ўключаюцца таксама ў змест падручнікаў і навучальных дапаможнікаў.

— Якія асноўныя патрабаванні да сучасных навучальных праграм, і на падставе чаго праводзіцца іх карэкціроўка?

— Працэс карэкціроўкі навучальных праграм ажыццяўляецца пастаянна, з улікам практыкі іх выкарыстання ў адукацыйным працэсе. Пры гэтым сваёй мэтай мы ставім скарачэнне колькасці абавязковых для засваення тэрмінаў, паняццяў. Вывучэнне асобных тэм, якія маюць пераважна тэарэтычны характар, мы пераводзім на азнаямленчы ўзровень. І, як я ўжо казала вышэй, істотна ўзмацняем практычную накіраванасць зместу адукацыі, фарміруючы такім чынам у навучэнцаў практычныя ўменні і навыкі, якія спатрэбяцца ім у паўсядзённым жыцці. Напрыклад, ацэнка дакладнасці інфармацыі. Важна для сучаснага дзіцяці? Вядома, так. Або аргументацыя ўласнага меркавання, бяспечныя паводзіны ў сетцы Інтэрнэт. Рэчы, цалкам відавочныя для дарослага чалавека, не заўсёды відавочныя ў падлеткавым узросце. Пра іх трэба расказваць, ім трэба вучыць.

— Па якіх прадметах навучальныя праграмы зведалі апошнім часам самыя сур'ёзныя змены і чаму менавіта па гэтых прадметах?

— Сёння вялікае, калі не асноватворнае, значэнне мае рэалізацыя выхаваўчага патэнцыялу навучальных прадметаў. У праграмы ўключаюцца тэмы, якія раскрываюць дасягненні нацыянальнай культуры, навукі, спорту, эканомікі і якія накіраваны на выхаванне каштоўнасных адносін да гістарычных і культурных дасягненняў беларускага народа.

Напрыклад, у 2024 годзе ў праграму «Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь» для чацвёртакласнікаў уключана інфармацыя пра Герояў Беларусі. Па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі» ўдакладнены асноўныя патрабаванні да вынікаў навучання: шостыя — восьмыя класы павінны ведаць гістарычныя формы дзяржаўнасці на тэрыторыі Беларусі, дзявятыя класы — нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці, вучні дзясятых-адзінаццатых класаў — умець адрозніваць гістарычныя і нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці. Важныя дапаўненні ўнесены і ў змест вучэбнай праграмы па грамадазнаўстве. У яе ўключаны пытанні «Традыцыйныя духоўна-маральныя каштоўнасці», «Сацыякультурныя каштоўнасці беларускага грамадства», «Гістарычная памяць беларускага народа» і іншыя.

Не абышлі бокам і такую тэму, як здароўе нацыі. Напрыклад, пытанні, звязаныя з прафілактыкай наркатычнай залежнасці, унесены ў змест вучэбных праграм па біялогіі, фізіцы, хіміі, фізічнай культуры і здароўі, грамадазнаўстве, асновах бяспекі жыццядзейнасці, дапрызыўнай і медыцынскай падрыхтоўцы.

Рабочыя групы па распрацоўцы зместу літаратурнай адукацыі рэгулярна праглядаюць спісы мастацкіх твораў, якія вывучаюць школьнікі, і дапаўняюць іх, уключаючы ў праграму тыя, якія выхоўваюць у юных беларусах пачуццё грамадзянскасці і патрыятызму.

Алена ВІНАГРАДАВА.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 2 (77)

ЯКІ ПРАГНОЗ У НАС НА СЁННЯ?

Белгідрамету 100 гадоў. Дасягненні і перспектывы развіцця

Са старажытных часоў людзі назіралі за надвор'ем, каб прадбачыць яго, кіраваць ім. Прыносячы ахвяры багам, нашы продкі спрабавалі выклікаць дождж, разагнаць аблокі, прадухіліць ураганы і іншыя бедствы. Упершыню сістэматызаваць назіранні паспрабаваў Арыстоцель у трактаце «Метэаралогіка». Нягледзячы на тое, што шмат у чым старажытнагрэчаскі філосаф памыляўся, яго развагі паклалі пачатак навуцы аб атмасферы і прыродзе.

У XVII стагоддзі былі сканструяваны асноўныя прыборы, неабходныя для вымярэння хуткасці і напрамку ветру (флюгер, анемометр), тэмпературы (тэрмометр), вільготнасці паветра (гігрометр). Паступова пункты назіранняў аб'ядноўваліся ў сетку, каб даваць больш дакладныя прагнозы.

У Расійскай імперыі сістэматычныя навуковыя назіранні за надвор'ем сталі весціся пры Пятры I, а на тэрыторыі Беларусі першая станцыя пачала працаваць у Магілёве ў 1808 годзе.

Сёлета Белгідрамету спаўняецца 100 гадоў. Давайце прасочым, як развівалася метэаслужба, чым яна займалася на працягу гадоў, а таксама вылучым найбольш значныя яе дасягненні.

1924. Першага ліпеня пры Народным камісарыяце земляробства БССР адкрываецца Метэабюро, якое ў будучыні ператварыцца ў дзяржаўную гідраметэаралагічную службу нашай краіны. У першую чаргу яно ажыццяўляе кіраванне і забеспячэнне дзейнасці сеткі назіранняў, займаецца зборам і апрацоўкай даных з яе, а таксама даводзіць неабходную інфармацыю да зацікаўленых ведамстваў і арганізацый.

1929. Назіранні на станцыях праводзяцца ў тры тэрміны і ў асноўным анемометрам Фуса, гігрометрам валасяным, рознымі тэрмометрамі, дажджамерамі з абаронай Ніфера, флюгерамі Вільда з лёгкай дошкай, геліёграфамі Кэмпбэла, тэрмографамі Рэамюра.

1930. Ствараецца Беларускі гідраметынстытут, у склад якога ўключаны: Беларуская геафізічная служба, Навукова-даследчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі з сеткай метэастанцый, гідралагічная частка Наркамзема з сеткай вадамерных і дажджамерных пастоў, іншыя ўстановы.

1931. Бюро надвор'я аналізуе сінаптычную сітуацыю і прагназуе надвор'е, складаючы сінаптычныя карты за адзін (ранішні) тэрмін назірання. Метэаролагі кожныя тры гадзіны выходзяць на метэапляцоўкі, робяць назіранні, даныя запісваюць у сшыткі, а затым перадаюць іх па тэлексе ў цэнтр.

Сінаптычныя зводкі прымаюцца тэхнікамі па мікрафоне і адразу наносяцца на сінаптычную карту. Са спецыяльна абсталяванай будкі па карце ў эфір перадаецца кансультацыя для авіяметэастанцый.

1939. На падставе аэразандзіравання складаюцца вышынныя карты барычнай тапаграфіі. У сукупнасці яны характарызуюць прасторавае размеркаванне ціску і тэмпературы ў атмасферы.

1945. Пры Бюро надвор'я адкрываецца радыёметцэнтр, які перадае ў эфір метэаралагічныя даныя з усёй тэрыторыі Беларусі і суседніх краін. Для складання карт шырока ўжываюцца даныя аэразандзіравання і шароў-пілотаў. Мноства арганізацый, размешчаных у Мінску, атрымліваюць прагнозы і папярэджванні аб небяспечных з'явах надвор'я па тэлефоне. З дапамогай радыёперадач насельніцтву два разы на дзень транслюруюцца сутачныя прагнозы.

Першыя назіранні за хуткасцю плыняў, змяненнямі вышыні ўзроўню вады, замярзаннямі вадаёмаў у Беларусі ажыццяўляюцца з канца XVIII стагоддзя. Устанаўліваюцца спецыяльныя слупы, на якія наносяцца пазнакі вясновых паводак і летніх межаняў. У пасляваенныя гады праграма назіранняў гідраметсеткі дапаўняецца актынаметрычнымі назіраннямі, назіраннямі над выпарэннем з глебы і воднай паверхні, радыёзандзіраваннем атмасферы.

1946. Ствараецца група доўгатэрміновых прагнозаў надвор'я малой своечасовасці. Прагнозы складаюцца не толькі на суткі, але і на 3—6 дзён.

1948. Уводзіцца прамая правадная тэлетайпная сувязь з Масквой, што значна скарачае час збору

метэа- і аэраінфармацыі. Тэлетайпы кругласутачна фарміруюць сотні тысяч тэлеграм з Паўночнага паўшар'я, што дазваляе не толькі павялічыць колькасць перадавальных даных для прыземных і вышынных карт надвор'я, але і пашырыць асартымент аэрасінаптычнага матэрыялу.

1950-я гады. Станцыі атрымліваюць новае абсталяванне: асадкамеры Траццякова, флюгеры з цяжкай дошкай, глебавыя выпарнікі ГДІ 3-га разраду. Пачынаюцца назіранні за сонечнай радыяцыяй.

1958. Сіноптыкі апрацоўваюць і рыхтуюць мноства карт і графікаў, таму ім катастрафічна не хапае часу для абдумвання прагнозаў і кансультацый арганізацый. Каб вырашыць гэту праблему, Цэнтральны інстытут прагнозаў у Маскве пачынае перадаваць Мінскаму бюро надвор'я па факсімільнай сувязі шырокі спектр гатовых сінаптычных карт.

1969. На тэрыторыі Беларусі, упершыню ва ўсім СССР, аўтаматызавана 50 метэастанцый, уведзены ў эксплуатацыю тры метэарадыёлакатары і сістэма радыёзандзіравання атмасферы «Метэор».

1973. Адкрываюцца лабараторыі, якія займаюцца атрыманнем даных аб канцэнтрацыях забруджвальных рэчываў у паветры і ападках, адборам проб глебы і снежнага покрыва, праводзяць аналіз паверхневых, падземных і сцёкавых вод.

1978. Ствараецца адзіная ў Беларусі станцыя фонавага маніторынгу, дзе праводзяцца даследаванні проб атмасфернага паветра на дыяксід серы, серавадарод, дыяксід азоту, аксід вугляроду, фармальдэгід.

1987. У Брэсце адным з першых у СССР пачынаецца вопытная эксплуатацыя аэравылічальнага комплексу АВК-1, які праводзіць аўтаматычную апрацоўку радыёзандзіравання.

Служба метэапрагнозаў займаецца аператыўнай работай: ажыццяўляе кругласутачны маніторынг пагодных працэсаў, складае прагнозы, папярэджванні аб неспрыяльных і небяспечных з'явах.

1990 — сённяшні час. У гідраметэаслужбе фактычна ўсе працэсы аўтаматызаваны. Выкарыстоўваюцца даныя штучных спадарожнікаў Зямлі, радыёлакатараў, развіваецца лікавае мадэляванне. Выкарыстоўваюцца праграмны комплекс WRF — для аўтаматызаванага разліку прагнозу надвор'я, сістэма кіравання



кліматычнымі данымі CliWare, лічбавая платформа «МетэаКуб» — для візуалізацыі радарнай і іншай метэаінфармацыі.

На пунктах назіранняў устаноўлены АМС з камплектам датчыкаў для вымярэння асноўных метэапараметраў. Атрыманыя даныя адлюстроўваюцца на камп'ютары тэхніка-метэаролага, апрацоўваюцца з дапамогай спецыяльных праграм і перадаюцца ў службу сувязі і тэлекамунікацый.

Для вызначэння асноўных метэапараметраў па вышынях у Брэсце, Гомелі і Мінску ажыццяўляецца радыёзандзіраванне атмасферы. З дапамогай сучасных доплераўскіх метэалакатараў, устаноўленых у аэрапартах, праводзяцца назіранні за развіццём воблачнасці ў радыусе 200 км, вызначаецца від і інтэнсіўнасць метэаз'яў. Абнаўленне інфармацыі адбываецца кожныя 10 хвілін, што дае магчымасць своечасова выявіць дынаміку развіцця аблокаў і складаць папярэджванні.

Вышынныя карты надвор'я паказваюць размеркаванне асноўных метэапараметраў у верхніх пластах атмасферы. Сучасныя праграмныя комплексы па візуалізацыі фактычнай і прагнастычнай інфармацыі дазваляюць хутка атрымаць неабходныя даныя, вызваляючы сіноптыка ад разлікаў і пабудоў.

Як і раней, усе карты надвор'я і днём, і ноччу аналізуе дзяжурная змена. Гэта дазваляе сіноптыку зразумець, як рухаюцца цёплыя і халодныя паветраныя масы, як фарміруюцца і праходзяць розныя стадыі цыклоны і антыцыклоны, як і з якой хуткасцю перамяшчаюцца атмасферныя франты.

Для атрымання метэаданых у верхніх пластах атмасферы выкарыстоўваюцца радыёзонды, якія прымацоўваюцца да напоўненай вадародам абалонкі. Такія шарызонды дазваляюць сабраць інфармацыю аб вертыкальным размеркаванні атмасфернага ціску, тэмпературы і вільготнасці паветра, хуткасці і кірунку ветру ад паверхні зямлі да гранічных вышынь уздыму (да 40 км).

Спектр работ у Белгідрамеце шырокі. Тут праводзяцца не толькі метэа-, аграметэаралагічныя і гідралагічныя назіранні, але і ажыццяўляецца экалагічны і радыяцыйны маніторынг. Інфармацыя аб з'явах надвор'я накіроўваецца дзяржаўным органам, сілавым структурам, паліўна-энергетычнай і іншым галінам, каб яны маглі скарэкціраваць сваю дзейнасць у экстранных сітуацыях і мінімізаваць эканамічны ўрон.

Аксана САЛАВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД, Белгідрамета.

НА ШЛЯХУ «ЗЯЛЁНАГА» РОСТУ

У рамках II Нацыянальнага форуму па ўстойлівым развіцці адбылася панэльная дыскусія «Зялёны пераход да інклюзіўнага і ўстойлівага росту». Прадстаўнікі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, навуковых устаноў, грамадскіх экалагічных аб'яднанняў абмеркавалі такія тэмы, як эканоміка замкнутага цыкла, зялёны пераход да інклюзіўнага і ўстойлівага росту, ліквідацыя запасаў небяспечных адходаў, водныя рэсурсы як элемент канцэпцыі Нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця да 2040 года.

Як паведаміў падчас адкрыцця дыскусійнай пляцоўкі **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ГАЛАНАЎ,** устойлівае развіццё немагчыма без забеспячэння экалагічна спрыяльных умоў для жыццядзейнасці грамадства і грамадзян — забеспячэння экалагічнай бяспекі.

— У Рэспубліцы Беларусь ахова навакольнага асяроддзя адносіцца да ключавых кірункаў дзяржаўнай палітыкі і мае комплексны характар, які закранае ўсе прыродныя кампаненты, экасістэмы, а таксама эканоміку, ахову здароўя, навуку, адукацыю і іншыя сферы дзейнасці дзяржавы і чалавека, — падкрэсліў ён.

Намеснік міністра таксама адзначыў, што вырашэнне комплексу задач, якія прадугледжваюць захаванне паверхневых водных аб'ектаў, павышэнне якасці атмасфернага паветра, аднаўленне прыродных экасістэм і біялагічнай разнастайнасці, максімальнае выкарыстанне адходаў садзейнічаюць дасягненню экалагічных Мэт устойлівага развіцця (МУР).

— Беларусь актыўна рухаецца па шляху «зялёнага» росту, нізкавугляроднага развіцця, укаранення тэхналогій, якія забяспечваюць атрыманне дадатковых экалагічных, эканамічных і сацыяльных выгад: скарачэнне выкідаў парніковых газаў, стварэнне новых працоўных месцаў і інавацыйных відаў прадукцыі, — акцэнтаваў Віктар Галанаў.

У 2023 годзе Беларусь заняла 34-е месца сярод 166 у рэйтынгу дасягнення Мэт устойлівага развіцця. Краіны ў ім ранжыруюцца па агульным балe, якім вымяраецца прагрэс у дасягненні ўсіх 17 мэт. Беларусь набрала 77,5 са 100 магчымых балаў. У 2024 годзе Беларусь заняла ў гэтым рэйтынгу 30-е месца.

Александрына ПАРШЫНА.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

ЗАХОЎВАЦЬ ПРЫРОДУ — ЗАХОЎВАЦЬ РАДЗІМУ

Не можа быць любоў да роднага краю без беражлівых адносін да яго прыроды, імкнення захаваць жывёльны і раслінны свет, багацце зямных і лясных нетраў, падводных глыбінь. Без экалагічных ведаў, уменняў і навыкаў дзейнасці ў прыродзе. Аб гэтым гаварылі ўдзельнікі прэс-канферэнцыі «Патрыятычнае выхаванне праз экалагічную адукацыю і асвету».

Сустрэча аб'яднала прадстаўнікоў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства, Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця, Рэспубліканскага цэнтра дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Мінпрыроды, БРСМ. Кампетэнтныя спікеры расказалі аб праграмах і праектах экапатрыятычнага выхавання, што рэалізоўваюцца ў нашай краіне, і запланаваных мерапрыемствы ў гэтым кірунку.

— Узаемадзеянне сучаснага чалавека з прыродай, спажывецкія адносіны да яе рэсурсаў — праблема сусветнага маштабу. Згодна з Праграмай патрыятычнага выхавання насельніцтва на 2022—2025 гады, фарміраванне паважлівых адносін да роднай прыроды — неад'емная задача грамадзянска-патрыятычнага выхавання. У Беларусі пытанні асветы і адукацыі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя замацаваны заканадаўча і ажыццяўляюцца Мінпрыроды, Мінадукацыі, іншымі рэспубліканскімі і мясцовымі органамі ўлады, грамадскімі аб'яднаннямі і СМІ. І гэта дае вынікі.

Штогод у нашай краіне праводзіцца больш за 20 акцый і конкурсаў прыродаахоўнага кірунку: Дзень Зямлі, «Пасадзі сваё дрэва», «Разам за чыстую зялёную краіну» і іншыя. Экалагічная тэматыка інтэгравана ў навучальныя праграмы ўстаноў адукацыі, набіраюць абароты праекты «Зялёныя школы» і «Зялёныя класы беларускай сталіцы», школьнае лясніцтва.

Уцягванне дзяцей і падлеткаў у навукова-даследчую, практычную, культурна-забаўляльную, турыстычную экадзейнасць дапамагае ім стаць сацыяльна актыўнымі грамадзянамі, унесці свой уклад у вырашэнне экалагічных праблем, дазваляе самім займацца асветніцкай работай, — паведаміла **начальнік галоўнага ўпраўлення экалагічнай палітыкі, міжнароднага супрацоўніцтва і навукі Мінпрыроды Таццяна КАНАНЧУК.**

— Экалагічнае выхаванне — асноўны шлях вырашэння і прадухілення экалагічных праблем. Але немагчыма захаваць прыроду, не ведаючы яе, — падтрымаў **дырэктар Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця Руслан ШАЙКІН.** — Наша ўстанова адной з першых у Беларусі звярнулася да распрацоўкі «мадэлі прыродаахоўнай дзейнасці навучэнцаў». Яна заснавана на трох кампанентах — даследчым, асветніцкім і практычным.

Праект «Зялёныя класы беларускай сталіцы» (сёлета яму споўняецца пяць гадоў), паводле слоў Руслана Шайкіна, цяпер праходзіць стадыю перазагрузкі. Пераглядаецца метадычная база, патрабаванні да падрыхтоўкі педагагічнага калектыву. Проста быць бёлагам недастаткова. Неабходна мець глыбокія веды ў галіне арніталогіі, батанікі, заалогіі. Валодаць інфармацыяй, дзе і якія віды жывуць, умець вызначаць іх па голасе, вонкавым выглядзе. Быць мабільным, захопленым даследчыкам навакольнага свету.

У рамках праекта «Зялёныя класы беларускай сталіцы» нашы выхаванцы актыўна вывучаюць прыроду Мінска, дзякуючы чаму быў знойдзены ўнікальны парк, дзе растуць 12 відаў першацветаў, у тым ліку чырванакніжныя, калонія дзікага лясного голуба — вяхіра, вызначана заканамернасць размеркавання зяблікa паблізу МКАД. Прадставіць свае даследчыя працы дзеці могуць на штогадовай гарадской канферэнцыі зялёнакласнікаў.

Мы ўдзельнічаем таксама ў падрыхтоўцы навукова-метадычнага суправаджэння экасцежак горада. Гэта наш уклад у экаасвету мінчан і гасцей сталіцы. Распрацоўка маршрутаў і напаўненне інфармацыйных стэндаў выконваецца на дастаткова высокім навуковым узроўні.

У РЦЭК створана інтэрактыўная платформа «Патрыёт.бай». Тут сабрана інфармацыя пра найбольш маштабныя беларускія патрыятычныя праекты. Пляцоўка дае магчымасць трансляваць буйныя мерапрыемствы на шырокую аўдыторыю, абменьвацца вопытам па арганізацыі адпаведнага выхавання.

Практычны кампанент праекта рэалізоўваецца пераважна праз біятэхнічныя мерапрыемствы. Дзеці ствараюць сінічнікі, шпакоўні, кармушкі, штучныя гнездавыя кошыкі для вушастых соў і пустальгі. Аднойчы выраблі плывучы востраў. У Мінску шмат вадаёмаў, а значыць, і вадаплаўных птушак, у тым ліку такіх рэдкіх і палахлівых, як чомга, малая чайка. Ім патрэбны дадатковыя прытулкі, дзе яны маглі б схавацца ад цікаўных вачэй, адпачыць з птушанятамі і адправіцца далей па сваіх справах.

Мы саджаем таксама дрэвы. Гэта не толькі ўклад у азеляненне нашага горада, але і эфектыўны ўрок любові да прыроды. Бо мала пасадзіць, трэба яшчэ і даглядаць. Каб вы бачылі, як нашы дзеці ўлетку «выгульваюць» свае дрэвы: беражліва выносяць саджанцы ў гаршках на сонейка і ў цянёк, а ўвечары вяртаюць у лабараторыю.

— У праекце ўдзельнічае прыкладна 1500 дзяцей. Наш экалагічны рух набірае папулярнасць. Ужо расце другая змена: праводзім экаасветніцкія акцыі ў дзіцячых садках, водзім іх выхаванцаў на экасцежкі горада. Калі гэтыя малыя падрастуць, таксама стануць зялёнакласнікамі, — дадаў Руслан Шайкін.

Загадчык аддзела экалагічнай адукацыі і сацыякультурнай дзейнасці Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства (РЦЭК) Анастасія ПАРФІЯНОВІЧ коратка прэзентавала другі экалагічны праект — «Зялёныя школы» (у ім удзельнічае звыш 660 устаноў адукацыі з усёй Беларусі) і больш падрабязна спынілася на іншых рэспубліканскіх адукацыйных мерапрыемствах, якія праводзяцца ў цэнтры ў мэтах вывучэння гісторыі, культуры і прыроды Радзімы.

— Адным з найбольш значных з'яўляецца рэспубліканская экаакцыя «Сцяжынкамі Бацькаўшчыны». У рамках намінацыі «Жыве ў народзе памяць» навучэнцы збіраюць у сваіх рэгіёнах інфармацыю аб партызанскіх месцах, маршрутах баявой славы. Прадугледжваецца пасадка дрэў, прысвечаная 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецкіх захопнікаў і ў памяць аб загінулых земляках, — акцэнтавала ўвагу Анастасія Парфіяновіч. — З 2006-га раз у два гады праводзіцца злёт юных эколагаў Беларусі і Расіі «Экалогія без межаў» (сёлета ён адбудзецца з 16 да 23 ліпеня ў Нацыянальным парку «Нарачанскі»). Мэта — прыцягненне дзяцей і моладзі да практычнай дзейнасці па захаванні навакольнага асяроддзя, вывучэнне прыроднай спадчыны роднага краю, фарміраванне экаадказнага светапогляду, а таксама рэалізацыя асноўных задач Саюзнай дзяржавы па грамадзянска-патрыятычным выхаванні маладога пакалення.

Злёт праходзіць па пяці кірунках: арніталогія, батаніка, энтамалогія, глебазнаўства, гідрабіялогія. Арганізоўваюцца палявыя лабараторыі, дзе юныя эколагі сумесна з навукоўцамі праводзяць невялікія даследаванні, якія потым абараняюць на канферэнцыі. Праграма таксама ўключае знаёмства з Беларуссю, наведванне музея Вялікай Айчыннай вайны, экскурсію па Мінску.

***

Прырода — наймагутнейшы сродак эмацыянальнага ўздзеяння на пачуцці і эмоцыі чалавека. Калі мы навучым нашых дзяцей і падлеткаў любіць прыроду, берагчы і памнажаць яе рэсурсы, то вырасцім сапраўдных патрыётаў сваёй краіны.

Александрына ПАРШЫНА.

ЗУБРОЎ ПАБОЛЬШАЛА, АЛЕ ЗНІКЛІ ХАМЯКІ...

У навуковай супольнасці і сярод аматараў прыроды працягваецца актыўнае абмеркаванне праекта новай рэдакцыі Чырвонай кнігі Беларусі, якая павінна будзе выйсці ў наступным годзе. Па папярэдніх даных плануецца, што ў яе будзе ўключана 308 відаў раслін і 211 прадстаўнікоў айчыннай фаўны.

У параўнанні з дзейным сёння 4-м выданнем Чырвонай кнігі, якое змяшчае 203 віды жывёл і 303 — дзікарослых раслін, колькасць аб'ектаў аховы ўзрасце. Як расказаў дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча Дзмітрый Грумо, у флярыстычны пералік мяркуецца ўключыць 187 відаў сасудзістых раслін, 35 — мохападобных, 22 — водарасці, 29 — лішайнікі і 35 відаў грыбоў. Пры гэтым 26 відаў, якія сёння знаходзяцца пад асаблівай аховай (9 відаў сасудзістых раслін, 1 — мохападобны, 1 — лішайнік, 9 — грыбоў і 6 відаў водарасцяў), будуць выключаны, а 28 новых уведзены ў спіс.

Працягваецца работа па праверцы і абследаванні месцаў вырастання асобных рэдкіх відаў, робяцца абагульненні, пішуцца суправаджальныя нарысы. Да снежня спіс новай Чырвонай кнігі павінен быць цалкам падрыхтаваны. Аднак у навуковай установе звярнулі ўвагу на тое, што фактычна маніторынг за раслінным светам ажыццяўляецца штогод. І калі для выдання Чырвонай кнігі ўстаноўлена перыядычнасць не радзей як адзін раз на дзесяць гадоў, то гэта не азначае, што з яе выпускам спыняцца назіранні. Пры неабходнасці змены могуць уносіцца і ў дзейную рэдакцыю.

У том «Жывёлы», паводле слоў генеральнага дырэктара Навукова-практычнага цэнтра па біярэсурсах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Аляксандра Чайкоўскага, уключана быццам і нямшмат відаў — усяго 1,2 працэнта ад фаўністычнага складу, аднак для захавання біяразнастайнасці важны кожны від. Няма бескарысных жывёл. У кожнага ў гэтым свеце ёсць свая роля, сваё месца. Таму так важна зберагчы відавую разнастайнасць. З 5-га выдання Чырвонай кнігі прапаноўваецца выключыць 13 відаў, 11 з якіх насякомыя, але дадаць 21 новы від. Найбольшыя змены ў спісе сярод беспазваночных. А ў часткі чырванакніжных пазваночных жывёл мяркуецца змяніць клас аховы.

У выніку значнага росту колькасці зубра — у 9 разоў (!) — катэгорыю аховы для яго мяркуецца панізіць з III на IV. Паляпшэнні будуць зафіксаваны для мядзведзя, рысі, барсука, гарнастая. Сярод птушак навукоўцы фіксуюць станоўчую дынаміку ў папуляцыях арлана-белахвоста, дамавога сыча, залацістай шчуркі, драча. Хутчэй за ўсё, ручаёвую фарэль перавядуць з II у III катэгорыю.

Але ёсць і такія віды, стан якіх выклікае ўсё большую асцярогу. Шмат гадоў ужо няма афіцыйнага пацвярджэння рэгістрацыі пасялення звычайнага хамяка. Статус аховы для яго мяркуецца павысіць з III адразу на I. Нягледзячы на спробы аднавіць колькасць заходняга падвіду глушца: ахова такавішчаў, развядзенне ў гадавальніку, скарачэнне паляванняў, папуляцыя памяншаецца. Па назіраннях спецыялістаў, за апошнія дваццаць гадоў колькасць гэтых птушак знізілася практычна ўдвая. Навукоўцы прапануюць уключыць заходні падвід глушца ў Чырвоную кнігу Беларусі і ўстанавіць для яго II катэгорыю аховы. З-за актыўнасці інвазійнага ратана-галавешкі катэгорыю абарыгеннага віду — гальяна азёрнага вымушана павысяць з III да I.

А ў Мінпрыроды нагадалі, што ў мэтах захавання рэдкіх і тых, якія знікаюць, відаў раслін і жывёл пастаянна вядзецца работа па перадачы пад ахову і ўліку месцаў пражывання і вырастання чырванакніжных аб'ектаў. З 2021 года выяўлена і афармлена 1237 такіх месцаў. З іх у Брэсцкай вобласці — 85, Віцебскай — 160, Гомельскай — 157, Гродзенскай — 297, Мінскай — 449, Магілёўскай — 89. Таксама ўзяты пад ахову больш як 34 тысячы гектараў тыповых і рэдкіх прыродных ландшафтаў. У цэлым 56 % тэрыторыі краіны заняты прыроднымі экасістэмамі. Каля 41 % складаюць лясы, і за апошнія 30 гадоў лесапакрытыя плошчы павялічыліся на 14 %. Таму Беларусь на праве лічыцца лясной краінай, дзе клапоцяцца аб захаванні прыродных багацця.

Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ, фота аўтара.

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Дмитровичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Вешевка, ул. Лесковская, 21** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме (из акта)

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 5 х 9 м.

Площадь: 45,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1947 г.

Материал стен: бревно обшито доской.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей), Тюхай Степан Григорьевич умер 8.03.1985 г., Тюхай Мария Ивановна умерла 30.04.1986 г.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 30 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Дмитровичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Дмитровичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Дмитровичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок 801715 31420, 801715 31646, 8033 7197889.

УНП 600036574

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Дмитровичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Вешевка, ул. Лесковская, 19** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме (из акта)

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 6 х 8 м.

Площадь: 45,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1938 г.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей), Ермолович Татьяна Михеевна умерла 16.01.2004.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 20 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Дмитровичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Дмитровичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Дмитровичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

Телефоны для справок: 801715 31420, 801715 31646, 8033 7197889.

УНП 600036574

ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

Дмитровичский сельский исполнительный комитет извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, расположенный по адресу: **Минская область, Березинский район, д. Вешевка, ул. Садовая, д. 7А** (полный адрес указан согласно похозяйственным книгам), **имеющий основания для признания его пустующим.**

Сведения о жилом доме (из акта)

Наружные размеры одноквартирного, жилого дома: 5 х 6 м.

Площадь: 36,0 кв. м.

Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1951 г.

Материал стен: дерево.

Этажность: одноэтажный.

На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель. Дом в ветхом состоянии.

Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.

Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им (ей): Ермолович Алексей Алексеевич.

Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.

От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Дмитровичский сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.

Дмитровичский сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Дмитровичский сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

